Аляксандр Кваснеўскі ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Сынковіцкая царква ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 37 (2679) Год LII | Беласток, 16 верасня 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Касмічная зямля

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Аўкцыён у бельскай Гміннай управе

Не на прыбытак сеем нівы
І паліваем потам іх,
Нахлынуць трутні пражарлівы,
І мы ня ўбачым ніў сваіх.

Так пісаў Янка Купала дзевяноста гадоў таму. У чацвер 6 верасня ў бельскай Гміннай управе адбыўся аўкцыён зямельных участкаў з вёсак Храбалы, Гацькі і Райск. Некаторыя з гэтых участкаў выдзелены з большых суцэльных палеткаў, напрыклад, у межах гацькоўскага арэалу, на якіх раней гаспадарыў бельскі пэгеэр. Яшчэ раней былі яны прыватнай уласнасцю жыхароў названых вёсак, забраныя ў іх дзяржавай у час калектывізацыйнага галавакружэння. Сёння гэтай зямлёй распараджаецца Агенцтва сельскагаспадарчай маёмасці казны, а больш канкрэтна — сувальскае аддзяленне гэтай установы. І аўкцыён вялі сувальскія чыноўнікі на чале з Адамам Крухельскім.

На аўкцыённы продаж былі пастаўлены шаснаццаць участкаў: два з іх лічацца прыналежнымі да Храбал, тры — да Райска і адзінаццаць да Гацькоў. Цяпер нашчадкі колішніх уласнікаў захацелі вярнуць сабе тую зямлю — карміцельку іхніх продкаў. І, здавалася б, што яны павінны мець прыярытэт у вяртанні сваёй бацькаўшчыны, асабліва ў наш час, калі так многа гаворыцца пра захаванне не толькі прыродных каштоўнасцей, але і рознамаштабных культурных, у тым ліку мясцовых. Аднак такая тэорыя вельмі часта астаецца адно тэорыяй.

Аўкцыён быў абмежаваны да земляробаў Бельскай і суседніх з ёю гмін. Да яго запісалася васемнаццаць чалавек, аднак за продаж асталося змагацца толькі пятнаццаць. Са згаданых вёсак спачатку было многа ахвотных, але стаць да аўкцыёну ў Бельску асмелілася толькі чатырох; апошнія здаліся загадзя, палічыўшы свае шанцы бесперспектыўнымі. А гэта таму, што да спаборніцтва прыступілі грашавітыя людзі звонку. Ды і тых вонкавых аматараў чужой спадчыны можна падзяліць на дзве катэгорыі паводле стаўлення да мясцовага насельніцтва, бо частка з іх ставілася з пашанай, а частка з вялікапанскай пагардай, напрыклад, адзін з апошніх — сам з гміны Пасвентнае, які быццам прапісаўся ў Райск — заявіў, што купіць цэлы Райск разам з пеўнямі. Іншы, сам родам з-пад Сухаволі, прапісаны быццам у Райску, а ягоная сям'я ў Гусаках, мае ўсюды — і ў дырэкцыі агенцтва, і ў гміне — „ходы" і сакрэтныя веды, і вялікія грошы.

Каб даць уяўленне пра патрэбныя на аўкцыёне грошы падлічу для прыкладу адзін гацькоўскі ўчастак, плошчаю ў 10,00 га (4,7 га III кл. ды 5,2 га IV кл.), дзе зыходны кошт з 31 цэнтнера быў у выніку таргоў падбіты да 620 цэнтнераў! Значыць з яго трэба ў год сабраць па 62 цэнтнеры пшаніцы з аднаго гектара! Перамножыўшы гэта на яе цану (62,35 зл за цэнтнер), атрымаем амаль сорак тысяч злотаў — за дзесяць гектараў у год! Гэта толькі на сам чынш. А на апошнія расходы (паліва, машыны, угнаенні) трэба выпрацаваць яшчэ большы плён. Да гэтага трэба дадаць яшчэ адну пікантную інфармацыю: пасля трохгадовага беззаганнага гаспадарання пераможца аўкцыёна можа выйграны ўчастак купіць, за цану не меншую пятнаццацікратнасці вытаргаванага сабою гадавога чыншу. За прыведзены дзесяцігектарны ўчастак трэба было б заплаціць у такіх умовах пад мільён злотаў! Касмічная цана...

Дзеля нейкай арыентацыі на шырэйшым фоне прыгадаю, што плён пшаніцы ў пачатковых геркаўскіх гадах у Польшчы, калі пад збожжа падсыпалася бадай найбольш угнаенняў, крыху перасягаў трыццаць цэнтнераў з гектара, значыць удвая менш чым трэба цяпер заплаціць за зямлю кругом Гацькоў. Гэтыя абсурдныя цэны ўзяліся з таго, што частка ўдзельнікаў аўкцыёна хацела нахабна ўлезці ў чужое, іншая ж частка заўзята гэтаму супрацьстаяла. Абы толькі не дапусціць да захопу зямлі нежаданымі памешчыкамі, мясцовыя людзі рашыліся патраціць унесеныя ў аўкцыён залогі, сярэдняй вартасцю каля дзвюх тысяч злотаў ад участка. Дарэчы, як сказаў мне Ян Мордань, які мабілізуе мясцовых сялян адстойваць сваю бацькоўшчыну, гэты торг, нягледзячы на дзікія яго вынікі, і так з'яўляецца прагрэсам з ранейшым гаспадараннем ваколгацькоўскімі землямі, калі мясцовыя сяляне даведваліся пра яе растусоўку адно пасля прыезду новых іх уладальнікаў. Праўда, гэта можна было западозрыць і па блатных адносінах бельскага чыноўніка сувальскага агенцтва з некаторымі вонкавымі ўдзельнікамі аўкцыёна.

Цікава таксама ведаць, як ставяцца беластоцкія палітычныя чыны да справы пасляпэгеэраўскай зямлі ваколкі Бельска. Паслы ад правых груповак — Юзэф Клім і Кшыштаф Юргель — паказалі спрыяльнае зацікаўленне справай. Наш тутэйшы лева-дэмакратычны пасол — Яўген Чыквін — разводзіць рукамі, што ў гэтай справе нічога зрабіць нельга. І сяляне набіраюць перакананння, што ён нічога не паможа, адно толькі даглядае царкоўных спраў ды, заміж дапамагчы мясцовым людзям, змагаецца за Сербію і Косава. Варта дадаць, што ў мінулым годзе 120 гектараў зямлі з раенскага арэалу было перададзена Холмска-Люблінскай праваслаўнай епархіі па-за плячыма мясцовых земляробаў. Хто ўладзіў тую епархію сюды, мабыць, невядома... А тутэйшыя беларускія суб'екты змагаюцца за свае „важныя справы".

Сярод разьюшаных сатрапаў,
Паганы зладзіўшы хаўрус,
Свае таргуюць і чужыя
Табой, няшчасны беларус.

Так напісаў Янка Купала 10 чэрвеня 1914 года. З таго часу мінула 93 гады...

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

XI Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць XI Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. У конкурсе будуць разглядацца працы грамадзян Польшчы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— **I група:** дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— **II група:** астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, надрукаваныя на прынтэры або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 149** з прыпіскай на канверце: XI Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **16 лістапада 2007 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў снежні 2007 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Узнагароды

1. Арганізатары прыдбалі вартасныя ўзнагароды.

2. Арганізатары ўстанаўліваюць 1-3 узнагароды для найлепшых дэбютантаў. Аб падзеле і вартасці астатніх узнагарод рашае ўстаноўленае арганізатарамі журы.

Сакратарыят конкурсу:
Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok, tel. 085 743 50 22.

Конкурс праводзіцца пры фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.



Бульба і палітыка

З прыходам восені на Беларусі заўсёды актывізуецца палітычнае жыццё. Апазіцыя плануе правесці шматкольксны „Еўрапейскі марш", які павінен даць штуршок актыўнасці перад парламенцкімі выбарамі і засведчыць, што Палітрада Аб'яднаных дэмакратычных сілаў не спала ў шапку цэлае лета. Безумоўна, у розных кутках краіны будзе адзначацца „Дзень беларускай вайсковай славы", прысвечаны перамозе беларускіх войскаў над расіянамі ў бітве пад Оршай. На Гродзеншчыне ўжо ідзе падрыхтоўка да правядзення традыцыйнага „Дня палеглых за Айчыну" ў Свіслачы. У іншых рэгіёнах таксама ўсталяваліся свае традыцыі восеньскай палітычнай актыўнасці. Але, паўсюдна, будуць яны праходзіць з невялікім перапынкам на капанне галоўнай сельскагаспадарчай культуры — бульбы.

Бульба гэта святое. Недзе ў свеце называюць яе другім хлебам. А ў Беларусі кажуць, што хлеб — другая бульба. Каб не яна, то пры Савецкім Саюзе лягчэй было б рэалізаваць праграму па сціранню нацыянальных адметнасцей беларусаў і больш паспяхова праводзіць палітыку русіфікацыі. Беларусы і ад рускіх, і ад іншых якраз адрозніваліся тым, што кожны мусіў пакінуць гарадскую кватэру, каб паехаць памагаць бацькам парыцца ў зямлі ў пошуках некалі прывезенай з Амерыкі сельскагаспадарчай культуры. І справа нават не ў тым, што паліва на праезд да роднай вёскі часамі каштавала больш, чым увесь ураджай і што трэба было ўцякаць з асноўнай працы, рызыкуючы згубіць яе. Ніхто так не лічыў. Капанне бульбы стала і традыцыяй, і адной з нацыянальных адметнасцей. Зачыняліся школы, каб навучэнцы ехалі на калгасную зямлю збіраць бульбу. Прыязджалі дзеля гэтага студэнты навучальных устаноў. І нават нацыянальная прафесура сядзела на сельсканарыхтоўчых складах, акуратна перабіраючы клубні. Беларусаў у СССР так і называлі — бульбашы.

Капанне бульбы гэта і сямейнае, і нацыянальнае яднанне, галоўная тэма для размоў на пачатку восені. Усе дзеці, дзе б яны не былі, кінуць свае справы і прыедуць да бацькоў. Будуць шукаць каня, біць аб камяні дарагія машыны, ламаць жаночыя, так старанна дагледжаныя на працягу года ногці, дзерці вопратку, але яе, бульбу, капаць мусяць.

— Як у вас урадзіла бульба? — пытае сусед у суседа, сваяк у сваяка і нават чужак у чужака. Але гэта не галоўнае пытанне.

— Ці прыехалі дапамагаць вам дзеці? — вось галоўнае!

— Прыехалі, — з гонарам адказваюць бацькі. — А куды ж яны дзенуцца!

— І мае прыехалі. А вось бульба, на жаль, не ўрадзіла.

Неяк адзін з прафесараў біялогіі сцвярджаў мне, што пакуль беларусы на вёсках будуць садзіць бульбу, ніякай палітычнай актыўнасці чакаць няма чаго, бо словы „не ўрадзіла" да бульбы не маюць аніякага дачынення. Можа палегчы жыта, можа пазамярзаць цвет на чарэшнях, нават пчолы могуць не назбіраць мёду, але бульба, лепшая ці горшая, меншая ці большая, заўсёды будзе. А дзе ёсць бульба, там ёсць і сала, бо сала есць усё тую ж бульбу. А з салам і бульбай выжыць можна. І, маўляў, беларусы так ужо трыста год жывуць. Не ў асаблівай раскошы, але не галадаюць. Прывыклі і нічога іншага не шукаюць. Больш высілкаў укладваюць яны ў поле, таму і малаактыўныя на вуліцы.

Каб чалавек займаўся пошукам лепшай долі, у яго сапраўды трэба, каб быў неўраджай ці якія яшчэ праблемы. І тады, з голаду, ён і на вуліцу выйдзе і патрабаваць лепшага жыцця будзе. А як ёсць бульба, то ў чалавека адна праблема — як яе выкапаць і зберагчы. Вось і думай пасля гэтага чаго жадаць больш: каб бульба ўрадзіла, ці каб яе ўвогуле перасталі садзіць.

Але калі сур'ёзна, то прайшоў той час, калі бульбай адной быў сыты беларус. Цяпер яму неабходны бензін, газ, добры заробак, годнае жыццё і, самае галоўнае, свая незалежная дзяржава. А ў сённяшняга кіраўніцтва з гэтым усім узніклі праблемы. Больш прапанаванай чаркай і скваркай беларусы ў сваім жыцці абмяжоўвацца не жадаюць. Таму можна прагназаваць, што цяперашняя восень на Беларусі будзе надзвычай актыўнай. Можа некаторыя і капаннем бульбы захвяруюць.

Віктар САЗОНАЎ

Каціроўка

Прагнозы многіх польскіх публіцыстаў наконт ходу палітычных сімпатый у Польшчы не апраўдваюцца. Якія ўжо аўтарытэты не вяшчалі, што наступіць крах сённяшняй улады, увасабляемай братамі Качынскімі. А гэтая ўлада трымаецца і яе рэйтынг не падае, але нават даволі памяркоўна расце ў апытаннях выбарчых сімпатый. Чаму ж гэтак дзеецца, што тыя *wykształciuchy* не ўмеюць разгадаць душы свайго польскага выбаршчыка?

Я ўжо крыху быў заўважаў, што для здабыцця ўлады сённяшнія лідэры нашай дзяржавы пакарысталіся беларускім прыкладам. А вось для ўтрымання прыхільнасці да сябе яны цяпер таксама карыстаюцца прыкладам з усходу, толькі крыху далейшым — з Расіі. Папулярная ў рускамоўнай прасторы пагаворка, што „курыца не пціца, Польша не заграніца" тонка ўлаўлівае сходнасць менталітэту нашых братоў у славянстве.

Калі заглянуць у нядаўняе расійскае мінулае, дык кідаецца ў вочы кантраст паміж мізэрным грамадскім рэйтынгам пакойнага прэзідэнта Ельцына і высокім ім жа самім назначанага яго наследніка на пасадзе Пуціна. Тут назіральнікі, у тым ліку і польскія, заўважылі, што сталася гэта з-за ўзнаўлення Пуціным закончанай Ельцыным вайны ў Чачні. Што расійскаму чалавеку патрэбная перш за ўсё магутная дзяржава, якая перамагае не толькі на хакейных ці валейбольных спаборніцтвах.

Цяперашняе польскае лідэрства гарачай вайны не вядзе, але таксама напружвае сваю мускулатуру; маленькім прыкладам гэтаму нядаўні ваенны парад у Варшаве. А большым прыкладам гэтаму з'яўляюцца шматлікія польскія *wtręty* ў Еўрасаюзе, якія ў адзін момант наш прэм'ер-міністр матывіраваў лікам насельніцтва Польшчы ў 65 мільёнаў чалавек. А ў іншы момант заявіў, што Польшча такім чынам вядзе „партнёрскае" супрацоўніцтва з Германіяй.

Звычайны польскі чалавек, так жа як і звычайны савецкі, тужыць па радасных маладых гадах. У Беларусі і Расіі гэта туга па фразе „я другой такой страны не знаю, где так вольно дышит человек", гэта і туга па „шостай частцы сушы". У польскім вымярэнні іншыя азімуты, якія фарміраваліся таксама ў маладыя гады патрыятычнага выхавання, і то не толькі ў школе.

У апошнім часе той патрыятызм быццам стаў у нас забывацца. Не гаварылася ўжо, што наша мацарства мае мець заморскую калонію на Мадагаскары, мала ўжо афіцыйна гаварылася і пра Крэсы, усю увагу грамадства кіруючы на захад. А польскі патрыятызм неразрыўна звязаны з усходам, з прысутным у гістарычнай памяці мацарствам „ад мора да мора". І калі два гады таму кандыдат у прэзідэнты Дональд Туск з'ездзіў у Гродна сустрэцца з Анджалікай Борыс, яго рэйтынг далёка адарваўся ад сапернікаў. Спецыфічны патрыятызм вырваўся на волю і паказаў сваю сілу. Вось і нядаўна спадар Туск таксама хацеў паўтарыць свой нумар, але ў гэты раз беларускі бок рашыў не ўмешвацца ва ўнутраныя справы суседняй дзяржавы і не даў згоды выкарыстоўваць сваю тэрыторыю для польскіх гульняў у каціроўкі.

Аднак варшаўскія палітычныя лідэры знайшлі адмычку для карыстання ўсходнім козырам: Сейм увёў г.зв. Карту паляка. Паколькі прэса пра яе прыняццё інфармуе даволі гладка, значыць, гэтую ідэю падтрымалі ўсе парламенцкія групоўкі. Бо калі б хто спрабаваў паставіцца да яе крытычна, адразу праваліўся б у грамадстве з-за адсутнасці патрыятызму.

Згаданую Карту можа атрымаць асоба, якая заявіць, што мела польскіх продкаў і падпіша пісьмовую дэкларацыю аб сваёй прыналежнасці да польскага народа. І прынамсі пасіўна будзе ведаць польскую мову. І вось за гэта польская дзяржава такім дэкларатыўным палякам будзе м.інш. вяртаць кошт шэнгенскіх візаў. Вось яшчэ нядаўна польскія і беларускія чыны ўзаемна абвінавачвалі сябе ў абыякавасці да інтарэсу простага насельніцтва, а цяпер вось відаць сакрэты гэтай дыпламатыі. Ці наша дзяржава будзе таксама аплачваць кошты візаў сваім грамадзянам, што будуць падавацца ў Беларусь — пакуль мне невядома.

Якія тады меры прыме беларускі бок? Тамашнія гандляры запішуцца тады палякамі і змогуць *za friko „pracować w Polsce"*, прапануючы сігарэты і гарэлачку. А ўладныя структуры таксама спакойна спаць не будуць і зоймуцца не гандлярамі, толькі лідэрамі польскіх арганізацый. Паколькі ў Мінску ўлада ўсходняга паходжання і такога ж менталітэту, трэба тады спадзявацца галоўным чынам рэпрэсіўных мер. У адказ польскі бок можа таксама *podjąć adekwatne działania* ў адносінах да сваіх нацменаў. Як на гэта зрэагуе каціроўка „варшаўкі"? Здаецца, што гэтаксама як і Пуціну.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Карта паляка

Незадоўга да самароспуску польскага Сейма дэпутаты прынялі Карту паляка. З'яўляецца яна, як паведамляе змест абгрунтавання, „воляй ажыццяўлення маральнага абавязку Польскай дзяржавы ў адносінах да землякоў, якія з-за зменлівых лёсаў нашай Айчыны апынуліся па-за яе сённяшнімі межамі". Нашто прынята тая Карта, якая адносіцца выключна да грамадзян польскага паходжання, пражываючых у краінах былога СССР? У абгрунтаванні можна прычытаць: „Вырашальную ролю адыграў факт, што ў большасці краін былога СССР няма магчымасці захавання двайнога грамадзянства. Гэтым самым адымаецца палякам, пражываючым у гэтых краінах, магчымасць маніфеставання сваёй нацыянальнай прыналежнасці, што вядзе да страты нацыянальнага аблічча і драматычнага скарачэння ліку асоб польскага паходжання".

Каб атрымаць Карту, трэба перад консулам даказаць сваю сувязь з польскасцю, м.інш. прынамсі пасіўна ведаць польскую мову, „быць азнаёмленым і захоўваць польскія традыцыі і звычаі", да таго палянійнай арганізацыяй мусіць быць пацверджана „заангажаванасць у дзеянні ў карысць польскай мовы і культуры за перыяд прынамсі апошніх трох гадоў". Трэба будзе таксама даказаць, што прынамсі адно з бацькоў або дзядоў або двое прадзедаў было польскай нацыянальнасці або мелі яны польскае грамадзянства.

Карта паляка (хаця не абазначае атрымання польскага грамадзянства) нясе шэраг правоў. Так вось яе ўладальнік можа хадайнічаць за звальненне з аплат за выдачу побытавай доўгатэрміновай візы на шматразовы ўезд у РП або кампенсацыю тае аплаты. Уладальнік Карты будзе мець права паступаць у ВНУ ў Польшчы, карыстацца медычнай дапамогай у раптоўных выпадках, атрымаць 37-працэнтную льготу на праезд чыгуначным транспартам і бясплатны ўваход у дзяржаўныя музеі, хоць не вельмі ясна, чаму такіх льгот няма ў дачыненні да дзяржаўных і самаўрадавых тэатраў ці філармоній. Прытым Карта захоўвае сапраўднасць на працягу дзесяці гадоў з моманту яе выдачы, быццам бы пасля гэтага часу польскасць магла знудзіцца ці тая згаданая ў абгрунтаванні дэнацыяналізацыя яе ўласніку незалежна ад усяго таго „ўвайшла ў кроў".

У адным з артыкулаў закону можна прачытаць, што консулы могуць ануляваць Карту, калі „яе ўласнік паводзіць сябе ў спосаб, які ганьбуе РП ці палякаў". Мне здаецца, што ў адносінах да Беларусі, тамашнія палякі, якія дзейнічаюць у пралукашэнкаўскім Саюзе палякаў могуць мець сур'ёзныя праблемы з атрыманнем Карты. Падобныя дакументы прыняты былі ў некалькіх еўрапейскіх дзяржавах, сярод іх у Славакіі і Венгрыі. Знамянальны тут прыклад Венгрыі. Карта выклікала супраціў суседзяў. Тыя краіны заявілі, што парушае яна гарманічныя стасункі паміж іх карэннымі грамадзянамі і грамадзянамі з венгерскімі каранямі. Будапешт прыняў яе без кансультацыі з Браціславай, што выклікала незадавальненне ў сталіцы Славакіі.

Якія будуць рэакцыі ў былых краінах СССР пасля ўвядзення Карты паляка (асабліва ў Беларусі), цяжка сказаць. Наколькі ведаю, польскае МЗС ніякіх сур'ёзных кансультацый у гэтай справе з Мінскам, Масквой ці іншымі сталіцамі былых савецкіх рэспублік не праводзіла. Ці, аднак, мусіла, або ці павінна? Больш цікавае цяпер тое, ці, напрыклад, Беларусь зробіць што-небудзь, каб увесці нейкія палёгкі (асабліва звязаныя з уваходам Польшчы ў Шэнгенскую зону) польскім беларусам, якія датычылі б хоць бы льгот на візы.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Беларусь — частка Еўропы

Размова з АЛЯКСАНДРАМ КВАСНЕЎСКІМ — прэзідэнтам Польшчы ў 1995-2005 гадах

Мацей Халадоўскі: — ***Што Польшча, Еўропа і свет маюць зрабіць з гэтым клопатам, якім з'яўляецца Беларусь, калі ў гэтым вымярэнні гэта фактычна клопат?***

Аляксандр Кваснеўскі: — Беларусь гэта не клопат. Гэта краіна з народам, якому належыцца павага, якая мае сваю гістарычную карту, таксама і трагічную перыяду II сусветнай вайны. З 1991 года яна незалежная. Праблемай з'яўляецца дыктатура Аляксандра Лукашэнкі, значыць, ён сам і ягоны спосаб выконвання ўлады, захопліваючай дзяржаву. Польшча, асабліва ў новай сітуацыі, у якой апынулася ад 2004 года, павінна выкарыстаць Еўрасаюз як вельмі істотнага партнёра для абмежавання ўлады Лукашэнкі і збудавання дэмакратычнай альтэрнатывы. Карацей, Польшча павінна змагацца ўнутры ЕС за супольную еўрапейскую палітыку ў адносінах да Беларусі, палітыку, якая будзе вельмі дакладна і цвёрда ацэньваць уладанне Лукашэнкі, будзе падтрымліваць апазіцыйныя асяродкі, свабодныя СМІ, будзе арганізаваць стыпендыі для беларускай моладзі, каб тая магла спазнаваць тую адкрытую і талерантную Еўропу. Урэшце ж будзе таксама карыстацца ўсімі палітычнымі метадамі, каб рэжым Лукашэнкі быў больш гнуткі, каб аднойчы можна было шляхам дэмакратычных выбараў давесці да перамен. Польшча павінна таксама ўсведамляць Еўрасаюзу — я спецыяльна кажу аб ЕС, паколькі думаю, што нашы адзіночныя высілкі на гэтай палітычнай арэне могуць быць беспаспяховымі — што павінна націскаць на Расію. Без змены пазіцыі Крамля цяжкія будуць перамены ў Беларусі. Мне здаецца, што Масква трактуе Лукашэнку інструментальна. Гэта значыць, што там, дзе ёсць за што спрачацца, дык з ім спрачаецца. Адмяжоўваецца ад яго асабліва ў сваіх міжнародных стасунках, каб не несці за яго адказнасці. А там, дзе Маскве выгадна, Лукашэнка з'яўляецца і партнёрам важным, і такім, якога можна выкарыстаць. Змена расійскай палітыкі, большае зразуменне для апазіцыйных асяроддзяў і большы крытыцызм наконт паводзін Лукашэнкі былі б вельмі патрэбныя. А Польшча павінна развіваць тыя формы супрацоўніцтва, якія даступныя ўжо сёння: прыгранічнае супрацоўніцтва, супрацоўніцтва вышэйшых навучальных устаноў і розных арганізацый, падтрымка незалежных палітычных і журналіскіх асяроддзяў. Прытым, зразумела, мы павінны таксама дакладвацца да яе развіцця і падтрымліваць беларускую меншасць у Польшчы, паколькі гэта месца, дзе захоўваецца вельмі многа традыцыйных беларускіх каштоўнасцей: мова, культура, гістарычныя веды. Я думаю, што гэтыя асяроддзі ў змозе вылучыць лідэраў, якія будуць выконваць ролю еўрапейскай інтэлігенцыі.

— ***Скажыце, калі ласка, ці ў час Вашага прэзідэнцтва пытанні звязаныя з Беларуссю кіраванай Лукашэнкам краналіся на еўрапейскіх форумах, ці кагосьці там фактычна Беларусь цікавіла?***

— Так, гэты пытанні выносіліся. Я сам стараўся гэта рабіць, а гэта няпростая справа. Еўрапейскі Саюз усё не сфармаваў таго, што я лічу вельмі істотным і што мы павінны падтрымліваць, а менавіта паглыбленне еўрапейскай інтэграцыі і супольнай замежнай палітыкі. Супольная замежная палітыка Еўропы знакаміта апраўдалася ў час украінскага крызісу 2004 года, калі мы змаглі, пакарыстаўшыся мандатам ЕС, давесці да дэмакратычных вырашэнняў, а ж пагражалі там сілавыя вырашэнні. Зараз відавочны той недахоп супольнай замежнай палітыкі, спрычынены тым, што некаторыя еўрапейскія дзяржавы іначай глядзяць на Расію і на былыя краіны СССР. Краінам Прыбалтыкі былога Савецкага Саюза ўдалося вырвацца з гэтага тыповага мышлення Еўропы; яны сёння ў НАТА, у ЕС і адносіны да іх ужо зусім іншыя. Украіна сёння таксама больш апазнаная і зразумелая ў Еўропе. Беларусь Еўропе — малавядомая.

Фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

— ***Мала? А можа Францыя прэзідэнта Сарказі ці Нямеччына канцлер Меркель не ўсведамляюць, што такі дзяржаўны быт як Беларусь увогуле існуе?***

— Усведамляюць. Ставяць, аднак, пытанні наколькі моцная нацыянальная ідэнтыфікацыя саміх беларусаў, чаму ўлада Лукашэнкі сустракаецца з досыць шырокім зразуменнем і падтрымкай. Я размаўляў з экспертамі, м.інш. брытанскімі, якія сцвярджаюць, што калі б сёння праводзіліся цалкам дэмакратычныя выбары ў Беларусі, то шанцы на перамогу Лукашэнкі вельмі вялікія. Маем, вось, праблему нацыянальнай ідэнтыфікацыі беларусаў, праблему неіснавання адкрытага грамадства, слабасць дэмакратычных устаноў у выглядзе апазіцыі, няўрадавых арганізацый, аўтаноміі шмат якіх галін дзяржаўнага жыцця як правасуддзе ці вышэйшыя школы, а ўрэшце слабасці вельмі кволых незалежных масмедыяў.

— ***Вы ўспомнілі аб тым, што варта на тэму Беларусі размаўляць з Масквой...***

— ... Гэта неабходна.

— ***Так, дык як тыя размовы весці?***

— Польшча па прычыне свайго геаграфічнага палажэння, гісторыі і традыцыі з'яўляецца натуральным партнёрам і адвакатам спраў Усходу ў рамках ЕС. Я мяркую, што на еўрапейскіх форумах ніхто не павінен здзіўляцца, што Польшча шмат гаворыць пра Украіну, Беларусь, і што павінна ўзяць слова і пра Малдову, і што гаворыць аб Расіі. Гэта наша прастора не толькі геаграфічная, але і гістарычная, у нейкім сэнсе таксама і культурная. Польшча адна тае палітыкі не ў змозе весці. Расія можа не памагчы ў пазітыўных працэсах. Спыніць, аднак, некаторыя працэсы яна ў змозе. Несумненна, павінна яна імкнуцца да таго, каб дэмакратычныя працэсы ў краінах, якія былі калісьці ў расійскай ці савецкай імперыях, развіваліся не горш самой Расіі, хоць яны неяк фенаменальна і ў Расіі не развіваюцца. Таму мы павінны размаўляць таксама праз ЕС. Хоць бы таму, што голас, скажам, спадарыні Меркель для прэзідэнта Пуціна значна мацнейшы, чым прэзідэнта Качынскага, які яшчэ з прэзідэнтам Пуціным не сустрэўся. Сёння прэзідэнцтва ў ЕС выконвае Партугалія і нават ёй лягчэй размаўляецца аб Беларусі з Расіяй, бо няма яе ў чым падазраваць: не з'яўляецца вялікай суседкай Беларусі, няма ў яе беларускай меншасці. Можа весці размовы аб прынцыпах, дэмакратычных фундаментах. ЕС у размовах з Расіяй аб Беларусі можа шмат здабыць. Напэўна са спіска еўрапейскіх пытанняў Беларусі нельга прапасці. Калі Еўропа хоча развівацца пазітыўна, мусіць вельмі рашуча дапамагчы ў еўрапейскіх памкненнях Украіны, дэмакратыі ў Беларусі, вырашэнні праблемы Прыднястроўя ў Малдове і ў яе гаспадарчых праблемах і — калі шырэй глядзець на Еўропу — завяршыць мірны працэс інтэгравання з Еўропай заходніх Балкан.

— ***Калі мы размаўляем, спадарыня канцлер Меркель сустракаецца ў Пекіне з прэзідэнтам Кітая, дзяржавы, аб якой гавораць, што пануе там дыктатура, падобна як і ў Беларусі. Наколькі я ведаю, ані канцлер Меркель, ані іншыя кіраўнікі краін-членаў ЕС не намерваюцца наведаць Беларусь. Значыць, існуе лепшая і горшая дыктатура? Гэта пытанне інтарэсаў?***

— Напэўна, таксама. Не можам трактаваць Беларусь як Кітай, паколькі мы ў іншым культурным коле. Калі кітайцы гавораць, што патрабуюць іншай мадэлі дэмакратыі чым заходнееўрапейская, то я ў змозе такі погляд успрыняць. Беларусь гэта несумненна еўрапейская краіна, апіраючаяся на хрысціянскія каштоўнасці і няма прычыны, каб сцвердзіць, што яна не даспела да дэмакратыі, што менталітэт беларусаў іншы чым у французаў, немцаў, скандынаваў ці палякаў. Беларусь з'яўляецца часткай Еўропы, а ў Еўропе ведаем, што дэмакратыя гэта недасканалая сістэма, але найлепшая, найбольш спрыяльная і для развіцця індывідуальнасці, і для будовы супольнасці, і ўшанавання меншасці, і кампрамісу, і канструктыўнага вырашэння праблем у міжнародным маштабе. Дэмакратыя пры ўсіх сваіх хібах дае шанц на вырашэнне канфліктаў, а пра дыктатуру гэтак не скажаш. Наш крытыцызм у адносінах да дыктатуры Лукашэнкі апраўданы, а наша асцярожнасць у крытыкаванні Кітая зразумелая. Дарэчы, адным з пунктаў візіту Ангелы Меркель у Кітаі было закрананне пытанняў захоўвання правоў чалавека ў адносінах да розных апазіцыйных груп. Кітай, мабыць, таксама пройдзе шлях трансфармацыі. У свеце XXI стагоддзя, калі маем новыя магчымасці камунікацыі, а ў Кітаі дэ-факта ўжо свабодны рынак, не ўдасца захаваць анахранічную пазіцыю камуністычнай партыі, якая сёння па сутнасці пазбаўлена ідэалогіі. З'яўляецца яна свайго роду ўправай кітайскай гаспадаркі пры свабодным рынку, такой назіральнай радай над тою гаспадаркай. Калі я быў у Кітаі ў 1996 г., мы вызначылі, што трэба абмеркаваць пытанні захоўвання правоў чалавека. На маё здзіўленне, першы аб іх пачаў гаварыць прэзідэнт Кітая. Запэўніваў, што калі ёсць кітайцы, якія хочуць выехаць з краіны, дык ніхто ім не будзе забараняць. Я спытаўся, які можа быць маштаб гэтай з'явы. Ён шчыра заўсміхнуўся і кажа: „Не ведаю, можа 200, можа 300 мільёнаў". Праўда ці не, для адказнага палітыка ў Еўропе ўява 200-300 мільёнаў прыехаўшых кітайцаў, далікатна сказаўшы, цяжкая. Абагульняючы, Беларусь павінна ўспрымацца па іншых мерках, бо звязана яна з еўрапейскай культурай і традыцыяй.

— ***Дык, можа, канцлер Ангела Меркель і іншыя еўрапейскаія кіраўнікі павінны размаўляць з Лукашэнкам?***

— Шматлікія прыклады дыктатур, якія былі ахоплены забаронамі кантактаў, паказваюць, што рэдка такія дзеянні штосьці змянілі. Нейкі высілак з боку ЕС, адблакіроўванне кантактаў з Беларуссю і размовы можа і мелі б якісьці сэнс. Вядома, пры ўмове, што не могуць гэта быць бланкавыя размовы, не апіраючыеся на чаканні, якія беларускі бок мусіць выканаць. Тыя мінімальныя спадзяванні гэта: спыненне перашкод у дзейнасці ці нават рэпрэсій у адносінах да апазіцыі, стварэнне большых свабод масмедыям і палёгка ў кантактах грамадзян са светам. Пакуль, аднак, не ўдалося пераканаць сур'ёзных еўрапейскіх палітыкаў нават не да змены, а хоць бы да іншага раскладу акцэнтаў на палітыцы ў адносінах да Беларусі.

— ***А ці Вам падабаецца прапагандысцка-палітычная мова Аляксандра Лукашэнкі?***

— Я не люблю такой мовы. Магу ацэньваць належным чынам нейкія папулісцкія ўмеласці Лукашэнкі, умеласць у адчытванні псіхалогіі часткі беларускага грамадства, яго патрэбы, каб быў той бацька, гаспадар, які здымае з людзей адказнасць, пакажа напрамкі. У Польшчы такое немагчымае. Мы на іншым этапе дэмакратычнага развіцця, хаця ўсё ж у нас працяг ☞4

У Бельскім павеце

Павятовы камендант паліцыі ў Бельску-Падляшскім звярнуўся да Управы Рады павета з заяўкай аб сфінансаванні куплі спецыяльнага сабакі для выяўлення пахаў наркотыкаў. Управа дала ў пачатку жніўня г.г. уступнае адабрэнне, даручаючы павятоваму казначэю падрыхтоўку юрыдычнай фармуліроўкі для гэтай здзелкі.

* * *

Згуртаванне людзей добрай волі „Рай” у Бельску-Падляшскім звярнулася да Управы павета за датацыяй на куплю паліва для самахода. Управа адмовіла з-за адсутнасці юрыдычнага абгрунтавання.

* * *

Управа павета дала згоду на ўтварэнне ў 2007/2008 навучальным годзе ў Комплексе школ н-р 1 у Бельску першага класа навучання па спецыяльнасцях: механік аўтамабіляў (18) і цясляр (15 вучняў).

Управа дала таксама згоду прыняць патранат над навуковым сімпозіумам „Прагрэс у еўрапратэзапластыцы клуба «Белавежа 2007»”, адводзячы ў павятовым бюджэце квоту 4 тысяч злотаў.

* * *

Па прычыне спаду ліку насельніцтва Бельскага павета ўзнікла неабходнасць змены кампанентаў платы старосты. Раней у Бельскім павеце пражывала за 60 тысяч насельніцтва, а зараз яго лік паменшаў да 59 958 чалавек (стан у верасні 2006 года), што аўтаматычна перамяшчае павет у ніжэйшы квотавы разрад платы і службовага дадатку старосты. Пастанову ў гэтай справе радныя прынялі 13 жніўня з ажыццяўленнем яе з датай 1 сакавіка 2007 года.

Зараз плату бельскага старосты складаюць:

— асноўная плата — 4 630 зл.;
— службовы дадатак — 1 550 зл.;
— стажавы дадатак — 20% ад асноўнай платы;
— спецыяльны дадатак — 40% ад асноўнай платы і службовага дадатку.

Міхал МІНЦЭВІЧ

Дапамаглі

27 жніўня г.г. мая суседка заўважыла шэршняў на шчыце майго драўлянага дома ў Новым Ляўкове (Нараўчанская гміна). Патэлефанаваў я на нумар 998. Зараз жа з самой раніцы прыехалі двое пажарнікаў і сцвердзілі, што ў неабжытай, апусцелай палавіне майго дома жывуць сабе грозныя шэршні. Была іх цэлая процьма. Ад столі далятали шоргат і гудзенне, быццам у вялікай пасецы.

Пажарнік надзеў спецыяльны скафандр і знайшоў паміж столлю (полапам і фанерай) два гнёзды шэршняў. Зрабілі яны такія соты як у пчол, у якіх быццам у даспелых шапках сланечнікаў варушыліся чэрві. Пажарнік апырскаў шэршняў і іх гнёзды інсектыцыдным сродкам, у выніку чаго ўдалося ўтаймаваць грозных насякомых, а затым пастрасаць іх і згрэбці ў мяшок. І ўсё ўціхамірылася ў маёй хаце.

Узяў я тэлефонную трубку і пазваніў ды падзякаваў за дапамогу шэфу пажарнікаў — каменданту Павятовай камендатуры пажарнай аховы ў Гайнаўцы. **(мох)**

3 ☞ працяг

Беларусь — частка Еўропы

шмат палітыкаў таксама прымяняючых папулізм і нацыяналізм, такую мову, якой карыстаецца Лукашэнка. Аднак я не сумняваюся, што ў гэтага роду палітыкі, выказанай такой мовай, кароткі гарызонт. Я не веру, каб у Еўропе ў эпоху мабільных тэлефонаў, спадарожнікавага тэлебачання, Інтэрнэту можна было ўтрымаць такія анахранічныя рэжымы як у Беларусі. Для таго, хто гэтага не зразумее, сутычка з г.зв. крытычнай масай будзе больш брутальнай, больш драматычнай.

— ***Гэта значыць, што магчымы дыялог, паразуменне паміж Лукашэнкам і апазіцыяй?***

— Дыктатары заўжды кончылі або цвёрдым метадам, давёўшы да такога канфлікту, што ўцякалі, калі яшчэ паспелі (а нават яшчэ і больш драматычна), або зразумеўшы, што іх час кончыўся і дыктатуру трэба лібералізаваць. Тэарэтычна магу ўявіць момант, што Беларусь, аколеная дэмакратычнымі краінамі, з вельмі хутка мяняючайся Расіяй, будуючай адкрытае грамадства і ўводзячай усё больш элементаў плюралістычнай дэмакратыі, не можа застацца ў такім палітычным кшталце. Гэта, аднак, у руках саміх беларусаў. Не дасца выслаць ім ніякага рэцэпта ані з Бруселя, ані з Варшавы.

— ***Лех Валэнса ў размове з „Нівай” сказаў, што Вы як прэзідэнт „не мелі ніякай галавы” да Беларусі. Ці фактычна так было?***

— У час майго прэзідэнцтва мы вялі вельмі эфектыўную палітыку ва ўсходніх напрамках. Валэнса дзейнічаў на іншым этапе. Яго мэтай было вывесці з Польшчы савецкія войскі і тут галоўным партнёрам былі СССР, Расія. І гэта ўдалося. Развал СССР быў для нас поўным неспадзевам. Я размаўляў аб гэтым і з Ельцыным, і з Шушкевічам, і з Краўчуком. Самі яны расказвалі, што іх рашэнне было адважнае, і што самі пасля яго спалохаліся. Пасля падзення СССР наша палітыка пайшла на іншыя, практычныя азімуты. У першую чаргу стала пытанне з'яднання Нямеччыны і з пункту гледжання Польшчы — неабходнасць заключэння трактата з Нямеччынай, які гарантаваў бы нязменнасць межаў і закрываў бы такім чынам пасляваеннае былое. І гэта ўдалося. Тады пачалі перамовы аб уступленні ў НАТА, што фіналізаваў ужо я ў 1999 г. У маёй палітыцы вельмі важным было, каб НАТА пашырыць і ўвесці ў гэты саюз краіны Прыбалтыкі былога СССР ды Славакію, каб атачэнне Польшчы максімальна было павязана ў адзін блок. І гэта ўдалося...

— ***Прэзідэнт Валэнса казаў мне, што ён марыў, каб НАТА пашырыць яшчэ на Украіну і Беларусь.***

— Я таксама хацеў пашырыць гэтую структуру на Украіну. Валэнса меў тое шчасце, што нейкі час супрацоўнічаў з Шушкевічам, а пасля пачалася эпоха Лукашэнкі, які ўжо і яму ўскладняў кантакты. Калі я стаў прэзідэнтам, некалькі разоў прабаваў пачаць з ім размовы, ды стварала гэта прыгнятальнае ўражанне, паколькі не паводзіў сябе ён у іх час *fair*. Нашы зацвярджэнні гэта было адно, а тое, што ён агучваў на прэс-канферэнцыях, датычыла зусім іншага. Гэта не было партнёрства. Было, аднак, партнёрства на іншых узроўнях, міністэрскіх. Ды цяжка было да чаго-небудзь дабіцца, бо ўсе яны былі пад вырашальным уплывам Лукашэнкі. Вернемся да вашага папярэдняга пытання. Прыбалтыка ёсць у НАТА. Польшча адыграла істотную ролю ў вырашэнні канфлікту ва Украіне. Беларусь застаецца праблемай, бо няма там партнёра для размоў. Апрача таго ёсць шмат палітычных актаў з боку Беларусі, якія мы мусім успрымаць як непрыязныя, хоць бы адносіны да палякаў у Беларусі, квазі-мілітарныя пагрозы, гульні з ганяннем быццам бы шпіёнаў. Пасля 1989 г. найменш нам удалося дасягнуць у стасунках з Расіяй, бо нашы інтарэсы нясходныя. Вось, хоць бы таму, што Расія не зацікаўлена дэмакратызацыяй Беларусі, а мы — так. Мы зацікаўлены падтрымкай украінскіх аспірацый у імкненні да Захаду, а Расія — не.

— ***А ці мы выпадкам не зневажаем Расію?***

— У мой час напэўна так не было. Хоць мяне нават да сёння крытыкуюць некаторыя правыя палітыкі, але я лічу, што меў глыбокі сэнс мой візіт у Маскву ў час шасцідзесятай гадавіны заканчэння II сусветнай вайны. Справа была ў тым, каб ушанаваць тых, хто змагаўся за вызваленне ад нацызму, гітлерызму, ахвяраваў у Польшчы найбольшай каштоўнасцю — жыццём. Павага да савецкіх народаў гэта штосьці звычайна адпаведнае ў такой каталіцкай краіне як Польшча, гэта нават абавязак. У адносінах да Расіі вырабляецца бязглуздзіца. Калі б мы, напрыклад, па сіле закону пачалі ліквідаваць шматлікія помнікі савецкім салдатам, пераносіць іх магілы, выклікалі б бессэнсоўную буру, якая была б згубай для польска-расійскіх адносін, а для расійскага грамадства было б гэта незразумелым. Палічылі б яны гэта актам няўдзячнасці, своеасаблівым варварствам. Мы павінны кіравацца нейкай гістарычнай уражлівасцю, не толькі наконт саміх сябе, але ў гэтым выпадку і Расіі. У польска-расійскіх сувязях не хапае грамадскіх ініцыятыў. За апошнія два гады адзінай такой ініцыятывай, якую можна добра ацаніць, з'яўляецца адкрыццё Польскага дома ў Пецярбургу першымі дамамі Расіі і Польшчы. Такіх ініцыятыў трэба значна больш і не толькі, напрыклад, у галіне культуры. Гэта можа адбывацца побач палітыкі, у якой паміж Польшчай і Расіяй ёсць доўгі спісак спрэчных пытанняў. І трэба памятаць, што Расія не зацікаўленая нашым перакананнем, што ў адносінах да яе ЕС павінен мець адну палітыку. Лягчэй яму працуецца, калі мае 27 партнёраў плюс той адзін, ЕС у цэласці. Дыпламатыя ёсць на тое, каб даваць сабе раду ў такіх сітуацыях. На жаль, у апошні час польская дыпламатыя зусім пасіўная.

— ***Ці ў гэтым свеце ўсё хутчэйшага пераплыву інфармацыі маюць сэнс падзелы на Усходнюю, Заходнюю, Цэнтральную, Цэнтральна-Усходнюю Еўропу?***

— Сярэдні. Маюць сэнс геаграфічны. У сэнсе сённяшняга інтэгравання Еўропы — меншы. У выніку пашырання ЕС маем шанц збудаваць Еўропу — з'яднаны кантынент, выкарыстоўваючы ўвесь свой патэнцыял. Вось гэта вялікі шанц, што будзем дзейнічаць паводле такіх саміх дэмакратычных прынцыпаў, такіх жа стандартаў публічнага жыцця на супольным рынку гаспадаркі і працы. Прытым з захаваннем адрознасцей звязаных з мовай ці традыцыяй. Вядома, існуюць таксама гістарычныя, ментальныя, культурныя адрознасці. Мы перажываем за апошнія пару дзесяткаў гадоў неверагодную камунікатыўную рэвалюцыю. Баюся, што стане яна тыпова эсэмэсавай. Усе будзем падобнымі. Усе, незалежна ці то беларус, паляк ці француз, будзем перадаваць сабе кароткія інфармацыі, якія будуць падставай новай мовы сувязі паміж людзьмі. Мабыць, тэхналагічныя змены будуць нас уніфікаваць, што неабавязкова мусіць быць толькі добрым, але гэта няўхільнае.

— ***Вы з'яўляецеся адным з бацькоў уваходу Польшчы ў Шэнгенскую зону. Ці няма ў Вас апасак, што і Вы давялі да таго, што пасля ўваходу ў гэтую зону ўзнікне новая заслона?***

— Мы доўга змагаліся, каб так не было. З Украінай увялі мы прынцып бясплатных віз. Польшча мусіць зрабіць усё, каб, будучы ўжо ў Шэнгенскай зоне, максімальна лібералізаваць усе абавязацельствы, якія датычаць нашых партнёраў з Усходу. Я пратэстую прытым супраць такога перакананння, што пасля ўваходу ў Шэнгенскую зону ускладнім кантакты з палякамі з Усходу. Візавая сістэма генеральна ў кантактах з Украінай, Беларуссю ці Расіяй не можа прыносіць істотных абмежаванняў з Польшчай. Польскія ўлады ўжо сёння павінны запрапанаваць увядзенне спецыяльнай прымежнай зоны з палёгкамі ў перасяканні мяжы. Можна задумацца над разбудаваннем консульскай сістэмы, над пашырэннем магчымасці выдавання шматразовых віз.

— ***Складаецца ўражанне, што Ваш фонд „Amicus Europae” займаецца галоўным чынам Украінай, а аб Беларусі забыўся.***

— На Украіне нам проста лягчэй знайсці партнёраў. Там сёння дзейнічае вельмі многа няўрадавых арганізацый. Я абяцаю, што не забудземся і аб Беларусі. Пад канец верасня ў Краковай к. Гданьска арганізуем летнюю школу. Яе ўдзельнікамі будуць таксама маладыя людзі з Беларусі. Я ў пастаянным кантакце са Станіславам Шушкевічам. Напэўна, Беларусь ахопліваецца нашай праграмай. Можа, „Ніва” дапаможа нам знайсці партнёраў?

— ***І амаль на канец. У Беластоку кажуць, што ў Вашай сям'і беларускія карані.***

— Ці беларускія яны, дык цяжка сказаць. З боку мамы мая сям'я паходзіць з беларуска-літоўскага пагранічча. Даваенны час і вайну правялі яны ў Вільні. НКВД выдварыў іх і яны перасяліліся на захад Польшчы, у Суленцін. Пасля частка сям'і вярнулася ў Беласток. Туды трапілі мая сястра і мамін брат. Жыве ў Беластоку і мой дзядзька. Гэта Міхал Балаш, вядомы архітэктар, які праектаваў шмат цэркваў і касцёлаў, м.інш. беластоцкую царкву Агія Сафія.

— ***І ўжо сапраўды на канец. Ці помніце, колькі Вы ў час свайго прэзідэнцтва паставілі свечак у цэрквах?***

— Шмат, вельмі многа. Дакладна не памятаю. Я агностык, але ў гэтай сімволіцы знаходжу сэнс. Можа, менш метафізічны, як больш асабісты. Калі я ў царкве ці касцёле, тады запальваю свечкі за нашых памерлых. Мой бацька памёр у 1990 г., мама ў 1995 г. Мама, дарэчы, што было для мяне вельмі балючым, на два месяцы да прэзідэнцкіх выбараў. Раней памерла мама маёй жонкі. Да нядаўна запальваў я кожны раз тры свечкі за іх душы і памяць. Ад гэтага года стаўлю ўжо чатыры. Памёр і мой цесць. Ва ўсіх цэрквах і касцёлах ва ўсім свеце я запальваю свечкі.

— ***Дзякую за размову.***

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Каб ты пайшла без сарочкі!

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Год таму Слава Касцюк, як першы ў Н., купіў электрычную касілку. Спачатку цацка заваладала над кавалерам і два першыя тыдні ён не выпускаў яе з рук. Касцюк зрываўся ў чатыры гадзіны раніцы, запускаў машынку і скрыгатаў па мазгах не звыклым да механічных гукаў аўтахтонам:

— А каб ты *спруціўся*! — пасылалі ў адрас піянера-мадэрнізатара пажаданні старажылкі.

Пасля бабулі пусцілі чутку, быццам ад Касцюковага гулу ў Н. перасталі несціся куры. Наколькі Касцюк, апантаны аматар яечні са скваркамі і цыбуляй, ён хутка зрабіў калькуляцыю прыбытку і страт ды пакорна адставіў сваю касілку ў шпіхер.

Зараз яго панадворак парастае трава, якую са смакам скубе авечка-*верасоўка*. Праўда, у Славы ўжо новае захапленне. Ён, як адзіны ў вёсцы, купіў аўстралійскую пасцель за 2 000 злотых.

— Добрая рэч! — кажа пра апошні набытак.

Цяжка сказаць, што прымушае нашага героя хваліць свой новы набытак. Напэўна не практыка. Пасцель у саставе: чахол, простынь і дзве навалачкі ляжаць запячатаныя ў фольгавым мяшку ў шафе пад замком.

* * *

— Я сам ледзь не купіў гэтай пасцелі, — Уладзік Максімкаў рады, што абараніла яго прыродная скупасць і нейкая сляпая выпадковасць. Хоць тое, што перажыў, будзе доўга памятаць.

— Жонка разводам палохала, — успамінае сваю прэзентацыю бацька найбольшай у Н. сям'і , — грозіла, што пакіне мяне аднаго з пяццю дзеткамі, а сама ў Ірландыю паедзе і там звяжацца з *чорным* як тая Тонька з суседняй вёскі...

На прэзентацыю аўстралійскай пасцелі Максімкавых запрасіла іх далёкая сваячніца:

— Дачка траюраднай сястры маёй жонкі па першай маці, — удакладняе спадар Уладзік.

— Ясна! — ківаю галавой.

— Нібыта, на сямейны банкет, — цягне спадар Уладзік, — такі *злёт*, на які мела з'ехацца ўся радня Касцюковых. Адны то нават з Амерыкі мелі прыехаць. Праўда, пасля ўвесь вечар Уладзік распытваў у свайго швагра Славы (Касцюка) пра сваякоў з Амерыкі. Пра апошніх толькі сёння дачуліся ў Н.

— Забі, не скажу! — бараніўся швагер. Прысутнасць амерыканцаў да белай гарачкі распаліла бедныя мазгі:

— А давай у Амерыку шмыгнем на якую будову, — прапанаваў у пэўны момант Уладзік.

— Давай! — пагадзіўся з месца швагер.

У народзе кажуць: швагер ніякая табе радзіна!

Але тут было наадварот. Сваякі моцна зрадніліся ў гэты вечар ды вырашылі ехаць на адной машыне на з'езд. Доўга захапляліся агульнай сваячкай з Гайнаўкі, якая запрасіла іх на імпрэзу. У апошняй справе Уладзік адчуваў сябе горшым, бо, як вядома, у гэтай канфігурацыі гэта ён быў шваграм.

* * *

Сярод гасцей, якія прыехалі на сямейны з'езд, швагры пабачылі бізнесмена з суседняй вёскі, свайго бацечку з матушкай ды многа-многа незнаёмых...

— Што тут за чорт? — не на жарты ўсхваляваўся Уладзік Максімкаў. Наколькі з энтузіязмам і надзеяй ён бачыў у сям'і амерыканцаў (якія чамусьці не з'явіліся) і бацюшку, настолькі з агідай думаў пра гандляра мясам, бізнесмена з суседства, вядомага пад мянушкай „Горыль".

— Вітаем на незвычайнай прэзентацыі, — прывітаў „сямейку" незнаёмы ў белым касцюме і з чужаземным акцэнтам. Цягам наступнай гадзіны ён стаў хваліць якасці аўстралійскай пасцелі за адзіныя 2 тысячы злотых.

Спачатку Уладзік Максімкаў палічыў незнаёмца сваяком з Амерыкі. І найбольш яму падабаліся намёкі на жаноча-мужчынскія справы.

— У нашай пасцелі, — намаўляў экзатычны госць, — будзе як у раю! Значыць, у ёй трэба спаць галяком, як маці нарадзіла. А пасля такой ночы вы прачнецеся ў новым жыцці. У вас будзе бодры настрой, пачуццё гумару, энергія.

Пасля прывёў прыклад нейкага немца, які дзякуючы іх пасцелі, перастаў быць імпатэнтам...

Далей незнаёмец звярнуўся да жанчын:

— Ці паверыце, — казаў з шырокай усмешкай, — што нашай пасцельці не трэба мыць. — Прытым стаў ён называць кошт парашкоў, якія кожны дзень ужываем для сцірання.

— А ці трэба мыць ногі да вашай пасцелі? — азваўся ні ў пяць, ні ў дзевяць Уладзік Максімкаў.

— Прашу не перашкаджаць! — абурыўся вядучы. Выглядала, што заўвага „сваяка" яго знервавала.

Спадар Уладзік не быў горшы, ён таксама абурыўся і выйшаў з залы. Не памятае як закончылася прамоцыя, бо ўвесь час праседзеў у машыне. Перажываў, што *згарэла* яго Амерыка.

* * *

У выніку „сямейнай сустрэчы" прададзена было пяць камплектаў пасцелі. Шчаслівым уласнікам стаў таксама Слава Касцюк. Каб здзейсніць сваю прагу цудоўнай перамены, кавалер скочыў у банк, дзе ад рукі і без паручыцеляў далі яму крэдыт.

— І тады мая баба ашалела, — кажа Уладзік Максімкаў. — Як насела на голаў! Як стане верашчаць! Палохаць разводам! Што пойдзе ад мяне і дзяцей у тую сваю Ірландыю!

Тры дні сушыла галаву. Кідалася з кіпцюрамі да вачэй. Не варыла, не пякла.

— Пойдзеш ты без *сарочкі!* — крыкнуў тады ў злосці ёй Уладзік.

— Я без... *сарочкі?* — вырачылася на яго шлюбная.

Апошні праклён напалохаў абоіх сужэнцаў. Перспектыва астацца голым, босым і нікому непатрэбным (такі сэнс праклёну) дзейнічала яшчэ мацней за абяцаны на прэзентацыі рай.

— І як ім не сорамна намаўляць людзей ісці без кашулі ў ложак? — гаварыла пасля ў адрас „сваякоў" пані Ірэнка па ўсёй вёсцы.

Праўдападобна з-за гэтага Слава Касцюк трымае сваю пасцель пад замком.

Ева СЦЕПАНЮК

Аўтакрамы

Аўтакрамы — неад'емны сюжэт вясковага краявіду. Даязджаюць яны да самых адлеглых мясцін (такое прыкмячаецца і ў памежнай Беларусі). Выгадна гэта старэчам ды інвалідам, паколькі для іх цяжкавата дабірацца ў горад ці адлеглую краму. Аўтакрама пад'едзе пад самую хату, а прадавец ветліва абслужыць. У адным праблема — цэны надта высокія. Аб гэтым пісаў Мікалай Лук'янюк на старонках „Нівы". Але такая ўжо логіка рыначнай эканомікі — за выгаду трэба плаціць!

У Кузаву, якая мяжуе з Чаромхай-Станцыяй і мае свой магазін, таксама заглядаюць аўтакрамы. Адна — з пякарні прыватнага прадпрымальніка ў Гайнаўцы, а другая — з Бельска-Падляшскага. Цэны ў абедзвюх, разумеецца, розныя, але і так абыходзіцца танней, чым у мясцовым магазіне. Але ёсць і загана. Паколькі на таварах няма этыкетак з цаной ды цэнніка ў прыкметным месцы, тады невядома колькі што каштуе. Не хочацца мне нікога абвінавачваць у махлярстве ці абдурванні кліента, але ўсё ж такі, калі справа тычыцца грошай, чалавеку ўсялякія думкі прыходзяць у галаву. Лепш было б, каб уладальнікі аўтакрамаў задбалі пра гэта і тады ўсё праходзіла б па закону. Так, прынамсі, мне здаецца. Гэтую ідэю прад'яўляю пад развагу чыноўнікам Дзяржаўнай гандлёвай інспекцыі.

(ус)

Брама пападае ў руіну

Перад колішнім школьным будынкам у Старым Ляўкове (Гайнаўскі павет) стаіць вялікая драўляная брама з дашкам пакрытам гонтай. Гэтыя вароты на тоўстых чатырох слупах можна лічыць помнікам старадаўнасці. Зараз ніколі не рамантаваны дашак пападае ў руіну.

Брама з'яўляецца арыгінальным архітэктурным аб'ектам у Старым Ляўкове. Жыве яна ў памяці выпускнікоў мясцовай школы. Браму з дашкам неабходна адрамантаваць. Хочуць гэтага жыхары Старога Ляўкова (выказаліся за гэта на вясковым сходзе), Новага Ляўкова і Плянты. Хадайнічаюць аб гэтым радныя Янка Целушэцкі і Юры Равінскі. Яны ставілі справу на сесіі Гміннай рады ў Нараўцы.

Драўляную браму (мела яна да 1970 года драўляныя арыгінальныя вароты) адмаўляецца рамантаваць толькі войт Нараўчанскай гміны. Прапанаваў ён нават раднаму разабраць яе і тады знікла б праблема. Адзін з ранейшых адказаў на прапанову жыхара Новага Ляўкова, але тады яшчэ не раднага, быў такі, што няма спецыяліста па пракладцы гонты. Адказы пана войта былі розныя. Шкада, што справа зайшла ў тупік, а брама з кожным годам пападае ў руіну.

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Фатаграфічны конкурс „БЕЛАРУС У ЕЎРАСАЮЗЕ"

Дарагія сябры! Мінулі канікулы, зноў пачаліся абавязкі, навука... Ад раніцы да вечара трэба сядзець у кніжках, практыкавацца ў задачах, зубрыць тэорыю. Праўда, большасць з вас з ахвотай ходзіць у школу. Там сябры. З імі весела і цікава. Можна пагаварыць пра ўсё на свеце, паназіраць за новымі з'явамі, пераменамі.

Мы таксама хочам пагутарыць з вамі пра новы і вельмі прэстыжны конкурс „Зоркі". На гэты раз мы прапануем конкурс на самую цікавую фатаграфію. Тэма конкурсу шырокая і шматзначная:

„Беларус у Еўрасаюзе".

Найперш нас цікавіць ваш індывідуальны погляд на працэс, вашы ўласныя заўвагі, назіранні або каментарый да названай тэмы. Героямі могуць быць вашы сябры, вы самі, вашы суседзі, сваякі, бацькі... (Адна падказка: нас не цікавяць вашы падарожжы па экзатычных краінах!).

На конкурс трэба даслаць тры фатаграфіі ў лічбавым або папяровым варыянце. Кожная з іх павінна мець не большы за адзін сказ подпіс.

Лаўрэатаў, якіх вылучаць фатографы-прафесіяналы і мастакі, чакаюць вартасныя ўзнагароды: **mp3-плэеры, USB-флешкі, кашулькі і шнуркі для тэлефонаў з мінулагодняга „Басовішча".** Самых выдатных аўтараў запросім супрацоўнічаць з нашай газетай!

Фатаграфіі дасылайце **да канца кастрычніка 2007 г.** па электроннай або звычайнай пошце на адрас „Нівы" з прыпіскай „Малады беларус у Еўрасаюзе".

Жадаем поспехаў!!!

Наце семнаццаць

Сёння маем свята ў хаце —
Год семнаццаць нашай Наце.
Яшчэ маем на прыкмеце —
Толькі год да паўналецця.
Выклікае страх пануры —
Два гады ўжо да матуры.
А каб гэтае адолець,
Пільнай трэба быць у школе.
Каб пасведчанне, як гонар,
Мець з палоскаю чырвонай,
Што, як сімвал, зразумела,
Сцяг наш бел-чырвона-белы.
А каб здзейсніць усё гэта —
Добра вывучаць прадметы.
Божа, дай дачусі сілы
Каб ёй вытрымкі хапіла!

Віктар ШВЕД
15 верасня 2007 года.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Выступае Наталля Швед

ГІСТОРЫЯ АБ ТЫМ, ЯК ТРЭБА ЎМЕЦЬ ЦАЛАВАЦЬ...

І здарылася так, што закахаўся ў прыгожую дзяўчыну Вальжынку цудоўны хлапчынка Касташ. І ўсё было добра, і ўсё было, ну проста, выдатна, ды нешта ніяк не давала Касташку спакою. І спаць перастаў, і есці не мог, як раней; усё нешта думаў, разважаў, сумняваўся... Пакуль проста не знік. На дзень ці на два — невядома. А калі зноў з'явіўся — Вальжынка ціха, каб ніхто не заўважыў, — трывожылася і перажывала. І вельмі чакала. Толькі маўчала, калі Касташ да яе падышоў, толькі спакойна ўзняла на яго свае сінія, свае прыгожыя вочы. І тады ён яе проста пацалаваў. У вочы, у вусны і ў шчокі.

— Ты прывёз мне вільготныя кроплі гарадскога фантана, — адказала яна пасля першага пацалунка, — салодкі смак садовых клубніц, — адказала яна пасля другога, — і гарачы подых прыдарожнага ветру, — усміхнулася пасля трэцяга.

І тады Касташка ўважліва ўгледзеўся ў шчаслівыя вочы Вальжынкі і — супакоіўся. І з таго часу, з таго самага часу — болей ніколі не сумняваўся.

Ваш Дзядзечка Сід
5 верасня 2007 г., Кобрын

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

Гардкор-2007
або Муха ціп-топ на канікулах
— 10 —

У апошні вечар лагера „Гардкор-2007” Шакальскі арганізаваў нам дыскатэку.

— Чаму ты гэта робіш? — хвалявалася жонка. — Ты ж ніколі не займаўся такімі пусцякамі. Ты ашалеў на канец ці як?

— Усім належыцца ўзнагарода, — сказаў хітра „Шакал”. — І хай пасля яны не наракаюць, што мы іх толькі мучылі!

Дыскатэка закончылася апоўначы. Усе ўдзельнікі лагера добра гулялі. Адно Дарота Шакальская не прыйшла на танцы. Яна не хацела глядзець як Пеця танчыць са мною ў пары. Цягам апошніх двух тыдняў Філіп не заўважыў, што ён падабаецца Ганцы. Ён саромеўся падысці да яе. Пад канец вечарыны дзяўчына не сцярпела, сама падышла да Філіпа і прапанавала яму затанчыць у пары. Кася танчыла з Кубам. І хаця ён быў „дрэсам”, аднак хлапец ёй спадабаўся. На дыскатэку прыехаў таксама Марцін, сын гаспадароў з Бондзішак. Ён закахаўся ў Соню. Хлапец не адпускаў дзяўчыну ні на крок.

— Добра, што ўжо канчаецца гэты *гардкор*, — шапнула я на вуха Пецю,

— Каб мы не прыехалі на гэты лагер, мы пэўна не сустрэліся б — адказаў хлапец.

— Ведаю, — сказала я.

Мы з Пецем успомнілі ўсе вясёлыя прыгоды, якія сустрэлі нас у гэтым страшным месцы.

Спадар Генік Ляскоўскі не прыйшоў на дыскатэку. У яго быў дрэнны настрой. Ён не мог прыйсці ў сябе пасля сустрэчы з Нягарчуком.

— І чаму ён прыдумаў мне такую гідкую задачу? — гадаў настаўнік фізкультуры. — Муха і яе сяброўкі — цудоўныя дзяўчаты, яны бегалі нават па калючых галінах. Хто іншы з іх класа рашыўся б на такі *гардкор*?!

У апошні дзень лагера ўсе маглі спаць аж да абеду.

— Ведаеце, мне крыху сумна пакідаць гэтае месца, — сказала сяброўкам Ганка.

— А мне хочацца плакаць, — сказала Соня. — Тут я пакідаю Марціна.

— Не хвалюйся, — суцешыла яе Кася, — хутка сабе знойдзеш іншага хлопца.

— А Міколка ўжо вярнуўся ў Беласток? — спытала Ганка.

— Ён напісаў мне эсэмэску, што астаецца да канца канікулаў, — паінфармавала нас Соня, якая адзіная мела мабільнік.

— А я не здзіўляюся яму, — кінула Ганка. — Ён мае тут вялікі поспех у дзяўчат!

А палове першай прыехаў за намі старэнькі сіні аўтобус. Праз тры гадзіны мы былі ўжо ў Беластоку. На сустрэчу нам прыйшлі ўсе настаўнікі гімназіі. Яны хацелі на ўласныя вочы пабачыць ці мы змаглі перажыць „Гардкор-2007”. І ці — як хацеў „Нягара” — мы перамяніліся. Значыць, вярнуліся сумнымі і прыгнечанымі.

Сярод настаўнікаў не было толькі новага дырэктара. Нягарчук захварэў пасля візіту ў лагеры. Не, яму не пашкодзіла наша яда! Ён не мог перажыць, што яго выхаваўчыя праекты прынеслі адваротны эфект, чым ён спадзяваўся...

Пасля нам сказалі, што Нягарчук кінуў школу!

Тэкст:<natasza05@wp.pl>
Дызайн:<lolcia05@tlen.pl>

Вершы Віктара Шведа

Гітара

— Купіў ты мне, тата, гітару,
Ты ж ведаеш, што я пяюн.
Аб ёй я даўным-даўно марыў,
Чаму ж яна, тата, без струн?

Чакаць не магу ні хвіліны,
Пакуль я яшчэ малады.
— Навучышся іграць на ёй, сыну,
Куплю табе струны тады.

Закон Архімеда

— Архімед разумным стаўся
чалавекам,
Закрычаў у ванне раптам ён:
„Эўрыка”.
А паводле беларускіх слоў
Абазначае, нешта ён „знайшоў”.

— Што ён знайшоў у ванне,
дарагі Даніла,
Адкажы на гэта дакладна,
як след.
— Думаю, што ў ванне знайшоў
якраз мыла,
Калі там купаўся ў вадзе
Архімед.

ГАЛЕРЭЯ ДЭКЛАМАТАРАЎ

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Марлена Дмітрук — Орля

Лукаш Марчук — Нараўка

Польска-беларуская крыжаванка № 37



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 33: Торт, шлюб, лілея, ар, вяселле, хата, эра, Ом, мінус, вальс, гот, мір, зубр, рахунак. Век, зуб, вір, шлях, мара, ліса, іл, бюлетэнь, беларус, ял, ас, за, Об, ер, гук, Об, тэрмометр.

Узнагароду, „Урок беларускай мовы” (фільм на DVD), выйграла **Мартына Сакалоўская** з Беластока. Віншуем!

Вяселле, як у мінулым

Калектыў „Цаглінкі” ўдала прэзентаваў абрад „сватоў”

У час III Вясельнай бяседы, якая адбылася 2 верасня ў гарадскім амфітэатры ў Гайнаўцы, найбольш выступіла беларускіх калектываў, а публіка магла дакладней пазнаёміцца з вясельнымі абрадамі Гайнаўшчыны і Пружаншчыны. Свае абрады прэзентавалі таксама народны калектыў з Украіны, цыганскі гурт і польская моладзь з Браньска, а гайнавяне і госці мелі магчымасць паслухаць эстрадныя песні на розных мовах, паглядзець на танцы і паспрабаваць вясельных цукеркаў.

Выступленні перад публікай папярэджваліся майстар-класамі, у час якіх на працягу некалькіх дзён вялася падрыхтоўка да прэзентацыі вясельных абрадаў. Самымі лепшымі спецыялістамі, якія наглядалі за рэпетыцыямі, былі старэйшыя жанчыны і мужчыны, якім даўнія вясельныя абрады вядомыя з досведу, паколькі на вяселлях сваіх сяброў і сяброўак прыходзілася ім быць старэйшымі сватамі, ці дружкамі. У мінулым бацькі і сваякі сачылі, каб сваты, лады, ці самое вяселле праходзілі без хібаў, не гаворачы ўжо пра таінства вянчання ў царкве, якое для веруючых было і застаецца самым важным элементам вяселля. Усё адбывалася згодна з мясцовымі абрадамі, а веды і вопыт перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Разрыў з традыцыяй стаў самым вялікім пасля масавага пераезду моладзі ў гарады і прыходу заходняй універсальнай культуры. Гайнаўскае вяртанне да мясцовых абрадаў, хаця толькі ў час масавага мерапрыемства, было добрай нагодай для адукацыі наймалодшага пакалення, якое радасна гуляла на пляцоўцы перад сцэнай пад эстрадную музыку, што гучала паміж прэзентацыямі абрадаў.

— Задачай калектываў будзе таксама зварухнуць публіку да гульняў, — гаварыў арганізатар бяседы, дырэктар Гайнаўскага дома культуры Андрэй Скепка.

Гурты, якія прэзентавалі эстрадную музыку і танцы, сходзілі са сцэны пры бурных апладысментах таксама і старэйшай публікі. Аднак асноўнай задачай бяседы было паказаць вясельныя абрады з захаваннем дэталяў. Дзеля гэтага прыйшла публіка, якая шчыльна запоўніла сядзячыя месцы ў даволі вялікім адрамантаваным амфітэатры, а многім прыйшлося нават стаяць некалькі гадзін. „Сваты” прэзентаваныя калектывам „Цаглінкі” з Ляўкова ўзрушылі не толькі маіх суразмоўцаў і перанеслі старэйшых людзей у час маладосці, калі шукалі яны сабе жонак і мужоў у сваіх сёлах, суседніх вёсках і гулялі на вяселлях сяброў.

— Вясельны абрад выклікае ў старэйшых людзей настальгію па мінулым, а ў памяці ажывае тое, што было ў маладосці. Забываем мы пра жыццёвыя цяжкасці і адпачываем. Палякі, якія выступалі на нашым мерапрыемстве, захоплены багаццем нашых абрадаў, — заявіў Аляксей Харкевіч, ураджэнец Лешукоў.

— Мы паказваем „сваты” такімі, якія былі ў нашай вёсцы ў мінулым, — гаварыла Надзея Кабац з „Цаглінак”. Кіраўнік калектыву з Ляўкова Мікола Мяжэнны пісаў сцэнарый выступлення на падставе падказак жанчын.

— Наша задача — паказаць дэталі абраду і цікава данесці іх да гледача. Дзеля гэтага і рыхтуюцца дыялогі для выступаючых асоб, — тлумачыў Мікола Мяжэнны.

Сваімі нестандартнымі выказваннямі весяліла публіку вядучая мерапрыемства Люба Гаўрылюк, якой дапамагала Анна Баран з ГДК. У кожным выступаючым калектыве былі таксама свае правадыры, якія ўводзілі спадарожныя вяселлям элементы гумару.

Гайнаўская публіка

— Старыя абрады занікаюць і трэба іх вяртаць, асабліва для маладога пакалення, якое іх не ведае, — тлумачыў Аляксей Харкевіч, адзін з вясельных правадыроў хору ГДК, які ўдала выступіў з абрадам „успамагання” і „благаславення” маладой (пасля правялі маладую ў царкву). Мае суразмоўцы з Гайнаўшчыны з сумам заяўлялі, што зараз на вяселлях людзі амаль не карыстаюцца мясцовымі абрадамі.

— Цяпер госці збіраюцца ў царкве і пасля вянчання пераязджаюць у рэстаран, дзе са старога абраду часта захоўваецца толькі „перапіванне”. Я ў маладосці жыла ў Круглым і памятаю са свайго вяселля поўны абрад, разам з „паненскім вечарам”, „караваем” і іншымі дэталямі, — тлумачыла Лідзія Сегень, якая выступіла з гайнаўскім хорам. Затое ў нашых гарадах і па вёсках сталі моднымі некаторыя абрады замацаваныя ў польскай традыцыі. Вясельнікі забаўляюцца ў час „ачэпінаў”, а маладыя людзі прыходзяць да вываду, што так гулялі нашы продкі — беларусы. У гайнаўскім амфітэатры якраз абрад „ачэпінаў” паказвала ў канцы мерапрыемства польская моладзь з Браньска. Намнога раней „выпечку каравая” прэзентавалі жыхары Уладзіміра-Валынскага (Украіна), якія ў галоўным паставілі на выступленні дзетак і моладзі з песнямі і танцамі, ды на народную музыку ў выкананні інструментальнай капэлы. Цыганскі гурт паказаў элементы свайго вясельнага абраду таксама з песнямі і танцамі.

Добра, што да сённяшняга часу захавалася традыцыя благаславення іконай маладых перад ад’ездам у царкву на вянчанне (рабіў гэта Аляксей Харкевіч) і акраплення асвячонай вадой машыны, на якой яны адпраўляюцца ў вельмі важную для іх дарогу (па пляцоўцы амфітэатра ішлі пяшком). Затое зусім непрадуманай традыцыяй стала стаўленне шклянкі з асвячонай вадой перад колам машыны. Пасля вадзіцель наязджае на дошку, якая раструшчвае шклянку, а пад коламі машыны разліваецца вада, якая асвячалася не для такога карыстання. Абрад гэты не прыносіць ніякіх карысцей маладым, а наадварот, можа прыцягнуць нейкае няшчасце. Калі вясельнікі не паспеюць прыбраць раструшчанага шкла, можа на яго наехаць іншы вадзіцель і прабіць шыну.

Абрад, які на Гайнаўшчыне называецца „перапіваннем”, а ў Пружанскім раёне „дарэннем”, паказаў Народны фальклорны калектыў „Бабінае лета” з вёскі Аранчыцы Пружанскага раёна. Сцэнарый да выступлення быў зроблены на падставе матэрыялаў сабраных у навакольных сёлах.

— Захоўваем мы ўсе дэталі разам з вынасам каравая, мыццём рук, ці завязваннем ручнікоў. Бачым, што нашае вяселле толькі дэталямі розніцца ад абраду, які захаваўся на Гайнаўшчыне, — сказала Яўгенія Васілюк з „Бабінага лета”. Жанчыны з беларускага калектыву паінфармавалі, што яшчэ ў іх вёсках захоўваецца многа дэталяў вясельнага абраду. Бяседы адбываюцца часта ў прыватных хатах, а танцы ладзяцца ў клубах або на спецыяльна падрыхтаваных пляцоўках на свежым паветры (зразумела, не зімой). Затое ў большых мясцовасцях традыцыя занікае.

Гайнаўскі дом культуры багатую вясельную сустрэчу ладзіў за еўрасаюзныя сродкі ў рамках праекта „Бліжэй сябе — гайнаўскія сустрэчы” і за грошы спонсараў з Гайнаўшчыны. На заканчэнне мерапрыемства арганізатары запрапанавалі супольныя гульні пад эстрадную музыку.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Сынковіцкая царква рыхтуецца да 600-годдзя

Сынковіцкая царква святога архангела Міхаіла знаходзіцца на Гродзеншчыне на мяжы Слонімскага і Зэльвенскага раёнаў. Сёлета ў канцы верасня плануецца адзначыць яе 600-годдзе. Больш падрабязна пра гэты юбілей і гісторыю царквы нашаму карэспандэнту расказаў яе настаяцель айцец Арсеній.

— ***Айцец Арсеній, скажыце, калі ласка, калі адбудуцца ўрачыстасці з нагоды 600-годдзя Сынковіцкай царквы?***

— Вельмі хутка — у нядзелю, 30 верасня. На юбілей чакаецца прыезд у Сынковічы некалькіх тысяч чалавек, у тым ліку і з краін СНД, Балтыі і Заходняй Еўропы. Ва ўрачыстасцях прымуць удзел і патрыяршы экзарх усяе Беларусі Філарэт, міністры, старшыні камітэтаў, прадстаўнікі іншых канфесій. І гэта невыпадкова, бо Сынковіцкая царква-крэпасць — адна з нямногіх цэркваў абарончага тыпу, што захаваліся на тэрыторыі Беларусі. Гэта помнік, у якім мастацкія плыні Захаду (готыка) і Усходу (традыцыі візантыйскай архітэктуры) зліліся ў адзіны сінтэтычны ансамбль. Царква з паўтараметровымі цаглянымі сценамі, вежамі і байніцамі нагадвае сёння старажытны замак.

— ***Якая плануецца праграма свята?***

— У 9 гадзін пачнецца боская літургія. У 12 гадзін на пляцоўцы каля храма адбудзецца канцэрт харавой музыкі, у якім прымуць удзел салідныя калектывы з Мінска і з іншых гарадоў Беларусі. І завяршыцца свята святочнай трапезай.

— ***Калі і як быў пабудаваны гэты храм у Сынковічах?***

— Сынковіцкая царква ў гістарычных крыніцах упамінаецца з канца XV — пачатку XVI стагоддзя. Яна, на думку некаторых даследчыкаў даўніны, збудавана ў пачатку XV стагоддзя. Але паданне кажа, што заклаў царкву вялікі князь Вітаўт. А магчыма, яна з'явілася і раней. У 1377 годзе памёр вялікі князь Альгерд, які, як пішуць летапісцы, „не столькі сілаю, колькі ўмельствам ваяваў". І пакінуў ён пасля сябе наступнікам любімага сына Ягайлу, які неўзабаве стаў каралём Польшчы. Пайшоў Ягайла вайною супраць свайго роднага дзядзькі вялікага князя Кейстута і сына яго, князя Вітаўта. Аднак не змог іх адолець. Тады задумаў ён жорсткую хітрасць. Запрасіў да сябе дзядзьку і брата і пакляўся, што не зробіць ім зла. А як толькі яны, паверыўшы ў клятву, прыехалі ў Вільню, паланіў абодвух. Вітаўта спачатку каля сябе пакінуў, а вялікага князя Кейстута загадаў у ланцугі закаваць і кінуць у вежу Крэўскага замка. Яшчэ праз некалькі дзён служкі Ягайлавы забілі слаўнага Кейстута. Потым у Крэўскі замак прывезлі і Вітаўта з жонкай. Сядзеў вялікі князь у Крэве пад моцнаю вартаю. Штовечар дзве кабеты прыходзілі слаць ложак яму і княгіні. А паслаўшы, выходзілі. За дзвярыма пакоя неадступна стаяла варта. Пачула вялікая княгіня Вітаўтава ад людзей, што калі Вітаўт не ўцячэ з вязніцы, дык тое самае з ім учыняць, што і з бацькам ягоным Кейстутам. І навучыла яна мужа свайго князя Вітаўта пераапрануцца ў адзенне адной з кабет, што прыходзіла ім слугаваць, а з другою — выйсці непрыкметна з пакоя. Паслухаў жонку Вітаўт, надзеў на сябе жаночае ўбранне, незаўважна спусціўся з замка і ўцёк да немцаў у Прусію. Але ў Прусію князь адразу не трапіў. Заблытваючы сляды ад Ягайлавых служак, ён пусціўся наўцёкі зусім у адваротны бок — да старажытнай Літвы, што знаходзілася тады за Наваградкам. І непадалёку ад Слоніма, у ціхай лясной вёсачцы Сынковічы, князь Вітаўт знайшоў сабе надзейную схованьпад сялянскай страхой. Потым, перачакаўшы варожую пагоню, сабраў надзейнае войска, пачаў перамагаць клятваадступніка Ягайлу і ўрэшце стаў адзіным уладаром Вялікага княства Літоўскага (так называлася раней наша дзяржава). Праз дваццаць пяць гадоў пасля ўратавання ад немінучай пагібелі вялікі князь Вітаўт загадаў пабудаваць у Сынковічах храм: у знак удзячнасці Богу і тутэйшым людзям, якія захавалі яму жыццё. Невядомыя таленавітыя дойліды выканалі Вітаўтаву волю і паднялі да нябёс Сынковіцкую царкву-крэпасць.

Настаяцель Сынковіцкай царквы протаіерэй Арсеній

— ***Гэта адна з версій. Хаця існуе некалькі.***

— Так. Гісторык Мікола Гайдук сцвярджае, што Вітаўт быў схоплены і пасаджаны ў крэпасць на Шчары. А крэпасцей на Шчары ў нас не было. Магчыма яго пасадзілі ў Сынковіцкую крэпасць.

— ***Тым не менш, заснавальнікам Сынковіцкага храма па праву можна лічыць усё ж вялікага князя Вітаўта?***

— Толькі Вітаўта. Гэта дзякуючы яму мы маем сёння такі унікальны помнік.

— ***Айцец Арсеній, хто найбольш даследаваў Сынковіцкую царкву?***

— Святар Яўстафій Міхайлоўскі, які быў тут настаяцелем з 1871 да 1898 года. Ён зрабіў царкоўную агароджу, званіцу, сам рамантаваў дах. На сценах храма ён знайшоў надпісы, датаваныя XII, XIII і XIV стагоддзямі, а таксама два званы. На адным з іх было напісана: „Anno Domini 1460". А між іншым, ніколі званы не заказваліся задоўга да будаўніцтва храма, калі, можа, нават ідэі такой не існавала. Напрошваецца думка: храм у Сынковічах у час адліўкі звона ўжо мусіў існаваць, і, можа, не адзін дзесятак гадоў. Таму, магчыма, ён сапраўды пачынаўся будавацца пры Вітаўту. А сама вёска Сынковічы яшчэ старэйшая за крэпасць-царкву.

— ***Чым унікальная царква ў Сынковічах?***

— Тым, што яна збераглася такою, якою была пабудавана. Царква ў Сынковічах — гэта чыста наш беларускі храм.

— ***Ці часта да Вас у Сынковічы прыязджаюць турысты?***

— Вельмі часта, з усіх куткоў свету, у тым ліку з Японіі, Францыі, Сінгапура, Італіі, Швецыі, Галандыі і г.д. Свае водгукі яны пакідаюць у кнізе наведвальнікаў храма. У царкву таксама прыходзяць сотні праваслаўных вернікаў з усёй Беларусі. Хаця наш прыход невялікі — усяго 134 двары.

— ***Хто сёння дапамагае храму?***

— У 2006 годзе Гродзенскім абласным Саветам дэпутатаў зацверджана праграма захавання і развіцця культуры Гродзенскай вобласці на 2007-2010 гады, якая прадугледжвае ў тым ліку і рэстаўрацыю Сынковіцкай царквы-крэпасці. Але грошы пакуль адтуль на храм не паступілі. Таму ўсе работы па добраўпарадкаванню царквы мы вядзем сваімі сіламі.

Тэкст і фота Сяргея ЧЫГРЫНА

Краса і сіла

Нядаўна атрымаў я з Мінска унікальную, энцыклапедычнага фармату кнігу „Краса і сіла. Анталогія беларускай паэзіі XX стагоддзя". Гэтае каштоўнае літаратурна-мастацкае выданне паявілася ў 2003 годзе ў Мінскім выдавецтве „Лімарыус" пад навуковай рэдакцыяй Алеся Пашкевіча. Рэдактарам кнігі і аўтарам абшырнага змястоўнага ўступу „Стагоддзе паэзіі. Слова рэдактара" з'яўляецца Анатоль Сідарэвіч.

Моцна напрацаваўся над падборкай вершаў у анталогію паэт Міхась Скобла, які аб сваіх цяжкасцях у пошуках вершаў-жамчужын расказвае ва ўступе з паэтычным загалоўкам „Радоўка радка на парнаскіх пашах. Слова складальніка". Аб аб'ёме працы найлепш сведчыць той факт, што М. Скобла цікава апрацаваў 358 змястоўных прадмовак да ўсіх аўтараў вершаў змешчаных у кнізе.

Анталогія „Краса і сіла" — першая спроба аб'яднаць пад адной вокладкай, на 880 старонках, найлепшыя ўзоры беларускай паэзіі XX стагоддзя.

„Унікальнасць гэтай анталогіі, — як сцвярджае ва ўступе яе рэдактар, — заключаецца ў тым, што ў ёй упершыню друкуюцца творы паэтаў, чые прозвішчы да нядаўняга часу нельга было згадваць без адмоўных характарыстык.

Ад папярэдніх гэтая анталогія адрозніваецца і тым, што ў ёй прадстаўлена беларуская паэтычная эміграцыя ад Алеся Смаленца пачынаючы. У гэткі спосаб канчаткова ліквідаваны штучны падзел беларускіх паэтаў на „нашых" і „нянашых", на „прыхільных" і „непрыхільных". У анталогію ўключаны творы паэтаў, якія пісалі і пішуць пабеларуску. Незалежна ад таго дзе яны жылі і жывуць, як яны ставіліся да Акту 25 Сакавіка, да якое палітычнае партыі належалі ці належаць, у якіх стасунках з цяперашняю ўладаю ў Беларусі знаходзіліся і знаходзяцца".

Надзвычай радаснай для нас з'явай з'яўляецца ўключэнне ў анталогію вершаў членаў Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа": Надзеі Артымовіч, Юркі Баены, Алеся Барскага, Яшы Бурша, Міры Лукшы, Зосі Сачко, Галіны Твараповіч, Яна Чыквіна, Дзмітры Шатыловіча і Віктара Шведа.

Уважліва, з вялікім захапленнем прачытаў я анталогію беларускай паэзіі і дайшоў да вываду, што аграмадны шлях прайшла наша паэзія на працягу мінулага стагоддзя. Колькі ж у ёй сардэчнай любові і цеплыні да сваёй краіны — Беларусі, да свайго народа, да роднай мовы!

Колькі ж у гэтых паэтычных жамчужынах, сабраных пад адну вокладку, непаўторнага хараства і магутнай сілы!

Віктар ШВЕД

У Беларусі знойдзецца нямала мясцін, якія адыгрывалі на працягу некалькіх стагоддзяў значную ролю ў гісторыі краіны. Праўда, нішто, створанае чалавечымі рукамі, не можа процістаяць часу. А ён няўмольны — сцірае гарады і цывілізацыі, робіць суцэльна бессэнсоўным сёння тое, што яшчэ ўчора мела найвялікшае значэнне.

Падобны лёс напаткаў нямала і беларускіх гарадоў. Яшчэ некалькі стагоддзяў таму яны былі цэнтрамі жыцця, а сёння далёка не кожны жыхар краіны нават ведае пра іх існаванне. У вялікай ступені гэтае датычыць мястэчка Любча, што знаходзіцца ў Гродзенскай вобласці і раскінулася на беразе Нёмана.

Паколькі гэтае мястэчка ці, як сёння кажуць у Беларусі, пасёлак гарадскога тыпу мае слынную гісторыю, то, не зважаючы на сціплую сучаснасць, варта бліжэй пазнаёміцца з яго мінулым, бо ў ім — прычыны і паслядоўнасці многіх падзей, якія мелі значэнне для цэлай краіны. Для гэтага мы, зразумела, не паедзем у Любчу, а толькі зойдзем на сайт па адрасе **http://lubcza.org**.

З першай старонкі партала адразу відаць, што мае ён не толькі адукацыйную ў плане гісторыі накіраванасць, але яшчэ імкнецца адыграць нейкую адраджэнскую функцыю. Аб гэтым, дарэчы, распавядае нават назва сайта: „Любча над Нёманам. Гісторыя. Адраджэнне".

Прэзентацыя віртуальнай Любчы вельмі ўдалая і нараджае жаданне знаёміцца з ёй больш шчыльна. Гэтаму спрыяюць і шматлікія рубрыкі, што распавядаюць аб старадаўніх і сённяшніх любчанскіх падзеях.

„Любча — невялікае мястэчка на беразе Нёмана з велічнай гісторыяй... — пішуць стваральнікі сайта. — Любчу ўважалі за свой духоўны цэнтр пратэстанты эпохі Рэфармацыі, тут праводзіліся сіноды-дыскусіі, друкаваліся духоўныя і свецкія кнігі, ствараліся музычныя і літаратурныя шэдэўры Адраджэння. Любчанскі замак быў адной з рэзідэнцый Радзівілаў, тут захоўваўся каштоўны збор сямейных рэліквій і твораў гісторыі і мастацтва гэтага магутнага роду. На жаль, XX стагоддзе прынесла занядбанне, адмаўленне ад уласнай гісторыі. Панішчаныя святыні — цэрквы і касцёл, пабураны замак. Забытае багатае мінулае. Але Любча — гэта мястэчка, дзе нараджаецца не толькі каханне, але і вера, і надзея. Вера ў адраджэнне".

Шчыра кажучы, калі справе адраджэння Любчы будзе надавацца столькі ж намаганняў, колькі распрацоўшчыкі сайта аддалі яго аздабленню, то можна спадзявацца, што мястэчка, без перабольшання, стане цэнтрам турыстычна-гістарычнага жыцця Беларусі.

Паколькі сайт не ёсць навінным, то асноўнае яго прызначэнне — спакойны расповед аб тым што было, і як дакрануцца да гэтага мінулага. Спрыяюць выкананню такой функцыі рубрыкі „Гісторыя", „Замак", „Культура", „Галерэя фотаздымкаў". Менавіта ў іх месцяцца легенды і ўспаміны аб любчанскіх падзеях, асобах, якія з гэтых берагоў Нёмана ўплывалі на гісторыю цэлай Беларусі. Праўда, ёсць хібы і на даным сайце — далёка не кожная падрубрыка змяшчае якую-кольвек інфармацыю.

Цікавыя звесткі пра адраджэнне гісторыі Любчы месцяцца пад такімі рубрыкамі як „Адраджэнне" і „Інфармацыя". З іх можна даведацца не толькі аб тым, як прыняць удзел у валанцёрскім руху, але і пра найбольш вартасныя для турыстаў цікавінкі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Як мыла з'еўшы

Пакуль мацнейшыя баскетбольныя дружыны Старога свету (у лік 16 лепшых трапілі амаль усе суседзі беларусаў) змагаюцца на кантынентальным першынстве, гульцы зборнай Беларусі бясслаўна завяршылі свой выступ у адборавай кампаніі дывізіёна „В". Прычым у змаганні за месца ў плэй-оф, які мог прынесці адзіную пуцёўку ў вышэйшую лігу, усё было ў іх руках. Апошні турнірны цыкл падначаленыя Аляксандра Барысава пачалі з прыкрай паразы Нідэрландам у гасцях. Хоць цягам паядынку перавага нашых суайчыннікаў сягала 20 пунктаў, яны ўмудрыліся прайграць. Здавалася, усе шанцы на агульнае першынство страчаны. Але заблытаная турнірная сітуацыя падарыла беларусам больш чым рэальныя шанцы. Перамогі над відавочным аўтсайдарам Албаніяй і досыць шэрай камандай Славаччыны прывялі да таго, што ў апошняй хатняй сустрэчы нашым трэба было проста адолець Вялікабрытанію — кожны пераможны лік задавальняў. Рэчаіснасць жа разбіла памкненні ўшчэнт, пасля матча нашы баскетбалісты пакідалі пляцоўку як мыла з'еўшы.

Перад сустрэчай праводзілі з вялікага спорту Андрэя Крыванова, які выступаў за нацыянальную дружыну з самага пачатку суверэннай каманды — з 1993 года. На жаль, змену залатому пакаленню беларускай моладзеўкі ўзору 1994 года так і не падрыхтавалі. Акрамя Крыванова і Руслана Байдакова, які ўжо развітаўся з дружынай, прыйшла пара „на пенсію" Аляксею Пынцікаву, Аляксандру Кулю, Дзмітрыю Кузьміну. Зараз гульню па-сапраўднаму „цягнуць" толькі двух — Ягор Мешчаракоў і Уладзімір Верамеенка. За іх плячыма амаль нікога, што і пацвердзіў чарговы раз вырашальны матч з брытанцамі, які быў прайграны дома з буйным лікам 51:83. Пра што можна казаць, калі каманда за апошнюю чвэрць забіла толькі 5 (!) ачкоў. Такі паказчык ганьба і трэнеру, і гульцам. А сістэма ратацыі паміж дывізіёнамі такая, што цяпер наступнай спробы падняцца ўгару трэба чакаць ажно тры гады.

Чарговы раз пабілі беларусаў румынскія футбалісты. Зусім нядаўна бухарэсцкая „Сцяуа" перайшла дарогу барысаўскаму БАТЭ ў Лігу чэмпіёнаў, а ў мінулую суботу Румынія ў адборавым матчы перамагла ў Мінску нашу нацыянальную зборную — 3:1. Такі ж лік на карысць саперніка быў і год таму ў Бухарэсце. Так што мяняюцца трэнеры і гульцы, а наш воз па-ранейшаму ў балоце турнірнай багны. Рэалісты і не чакалі цудаў ад новага трэнера Бернда Штанге. Апошні радыкальна абнавіў склад абаронцаў, што пакуль абярнулася правалам. Праблемы нацыянальнай футбольнай дружыны, так як і ў баскетбольнай, у дэфіцыце класных выканаўцаў. У гэтым цыкле зараз застаецца толькі адно — змагацца з албанцамі і славенцамі за 4-е месца ў групе. А колькасць набраных пунктаў у адборавым цыкле наўпрост уплывае на пасеў пры наступным лёсаванні.

А вось хто сапраўды парадаваў з беларускіх спартоўцаў на мінулым тыдні дык гэта тэнісісты Вікторыя Азаранка і Максім Мірны. Упершыню ў гісторыі чыста беларускі дуэт стаў пераможцам турніру Вялікага шлема! Азаранка і Мірны выйгралі мікст на адкрытым чэмпіянаце ЗША. Гэта стала найбольшай сенсацыяй US Open. Віка і Максім не так даўно аб'ядналіся ў пару, так што гэты дуэт можа мець доўгатэрміновую перспектыву.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Экскурсія ў Вільню

5 жніўня г.г. ад касцёла Святога Хрыстовага Сэрца ў Ольштыне паехаў я з экскурсіяй „Грамады" пабачыць Вільню.

Мне найбольш спадабаліся могілкі на Росе, якія лічацца аднымі з прыгажэйшых у Еўропе. Ад іх закладкі ў 1801 годзе да закрыцця ў 1965 годзе пахавана там многіх выдатных і радавых віленчукоў. Спачываюць там прафесары Віленскага універсітэта, паўстанцы 1831 і 1863 гадоў, мастакі, пісьменнікі, лекары, землеўладальнікі ды віленскія мяшчане. Не ўсе намагільнікі захаваліся, на некаторых з іх няма эпітафій, некаторыя зараслі травою, іншыя параўналіся з зямлёй, прозвішчы на шматлікіх з іх ужо забытыя. Няўмольны час — а часта і чалавечыя рукі — знішчылі шмат магіл і намагільнікаў, сямейных грабніц і каплічак. Спачываюць там вечным сном палякі, літоўцы, беларусы, немцы, яўрэі і іншыя. У 1969 годзе могілкі занесены ў спісак дзяржаўных запаведнікаў.

Могілкі на Росе распаложаны ў вельмі маляўнічай даліне. Расце там многа старых соснаў, дубоў, бяроз і шмат усялякіх кустоў. На могілках пракладзены ўсходкі і асфальтавыя алейкі. Могілкі займаюць абшар звыш шасці гектараў. Спачываюць там і сыны беларускай зямлі...

Ураджэнец Маладзечанскага павета Аляксандр Карніцкі жыў у 1872-1935 гадах. Адукацыю здабываў у Пецярбургу, у Ваенна-Медыцынскай акадэміі, якую закончыў у 1895 годзе з найвышэйшай пахвалай — *cum eximia laude.* Там жа атрымаў і вучонае званне доктара. Быў спецыялістам па акушэрству і гінекалогіі ў Радзільным доме імператрыцы Марыі, заняўшы ў час першай сусветнай вайны пасаду яго віцэ-дырэктара. Быў ён адным з арганізатараў тайнага пецярбургскага Гуртка польскіх лекараў. У 1921 годзе пераехаў у Вільню, дзе заняў пасаду дырэктара Дзяржаўнай школы акушэрак. Працаваў таксама ў акушэрска-гінекалагічнам аддзяленні Чыгуначнага шпіталя. Побач Карніцкага пахаваны Браніслаў Врублеўскі, юрыст, прафесар Віленскага універсітэта.

У іншым месцы пахаваны лекар-акуліст Ігнат Стшалінскі, ураджэнец Гродзенскай губерні, які заслужыўся ў барацьбе з трахомай на Віленшчыне. Далей ёсць магіла Антона Глінскага, народжанага ў Шчорсах пад Навагрудкам аўтара „Bajarza polskiego".

На евангеліцкіх могілках па вуліцы Малая Пагулянка быў пахаваны выдатны беларускі драматург Францішак Аляхновіч. Яго магіла з 1944 года не захавалася, на тым месцы быў узведзены Палац шлюбаў з паркам. У 1989 годзе беларускае таварыства „Сябрына" выхадайнічала размяшчэнне сімвалічнай магілы Аляхновіча на Росе. Францішак Аляхновіч нарадзіўся 9 сакавіка 1883 года ў Вільні. З дзяцінства быў ён звязаны з тэатрам. Тэатральнаму мастацтву вучыўся ў Варшаве. У 1907-1908 гг. быў акцёрам у польскім вандроўным тэатры. У 1908 годзе вярнуўся ў Вільню, пазнаёміўся з супрацоўнікамі „Нашай нівы" і стаў актыўным дзеячам беларускага тэатральнага руху. З-за праследу царскімі ўладамі ў 1910 пераязджае ў Кракаў, дзе выступае ў тэатрах, а ў 1913 — у выніку амністыі з нагоды 300-годдзя панаваня роду Раманавых вяртаецца зноў у Вільню, але амністыя не памагае і Аляхновіч праводзіць год у турме на Лукішках, дзе напісаў драму „На Антокалі". Пасля займаўся рознымі працамі, м.інш. быў нават паліцыянтам, а ў вольным часе пісаў далейшыя драматычныя творы. У 1919-1920 гг. арганізаваў тэатральнае жыццё ў Мінску, пасля зноў вярнуўся ў Вільню. У 1926 годзе паехаў у Мінск на канферэнцыю, прысвечаную беларускаму тэатру і там яго арыштавала НКВД. Сядзеў у лагеры на Салаўках да 1933 года, калі быў абменены на палітвязня польскіх турмаў Браніслава Тарашкевіча і вярнуўся ў Вільню, дзе зноў прысвяціўся беларускаму тэатру. З сакавіка 1944 года быў забіты савецкімі або польскімі партызанамі ў сваёй кватэры.

На Росе пахаваны і беларускі асветнік і паэт, ксёндз Канстанцін Стаповіч, які пісаў пад псеўданімам Казімір Сваяк. На ягонай магіле лацінскі надпіс „Kazimier Svajak, ks. Kastanty Stepovič poet 19 II 1890-6 V 1926". Ніжэй гэтага ўрывак з ягонага верша:

Idzie voś jasnaja para,
Praúdu świecić nam zara,
Ajčyna Maci Biełaruś
Haroj! Žyva!

Недалёка магілы Казіміра Сваяка пахаваны беларускі фалькларыст, паэт і архітэктар Лявон Вітан-Дубейкаўскі, ураджэнец Мсціслаўшчыны, які жыў у 1869-1940 гадах.

На Росе пахаваны і адзін з заснавальнікаў беларускай археалогіі граф Яўстафій Тышкевіч, які жыў у 1814-1873 гадах. Быў ён арганізатарам Віленскай археалагічнай камісіі, даследаваў курганы крывічоў, быў ганаровым членам Пецярбургскай і Стакгольмскай акадэмій навук і Лонданскага археалагічнага інстытута.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Злапаць пэрэпеліцу (2)

Фота архіў сям'і РАМАШКАЎ

(працяг; пачатак у 33 н-ры)

Два дні надвор'е не спрыяла жанцам: то ішоў дождж, то ізноў выглядала сонца. І так напераменку. А людзі то жалі, то зноў хаваліся пад ляшкі. Часам моцна грымела. Суседка Надзя з сястрой збіраліся ў лес. Казалі: „Растуць жоўценькія плісачкі, а мо ёсць і грыбочкі". Не пабаяліся дажджу і раненька , ледзь світала, разбудзілі і мяне.

— Хадзі з намі па грыбы, назбіраем, а калі прадам, то і табе куплю цукерак, — сказала сястра, цягнучы мяне за руку. Мне хацелася яшчэ паспаць, аднак збіраць грыбы я вельмі любіла і ўмела. І хоць сястра ніколі мне цукерак не купіла, я і так брала кошык, яблычак, кавалачак хлеба і бегла з ёю ў лес. На Глыбокай даліне сустрэлі мы Вірулю, Маньчыну сяброўку. „Не баіцца яна хадзіць адна па лесе!" — падумалася мне.

— Вось адзін грыбочак я знайшла, прыгожанькі, такі з чырвонай шапачкай, — пахвалілася нам.

Пад поўдзень мы вярнуліся дамоў. У гэты раз грыбоў мы не назбіралі, ды плісак паўкошыка, — будзе добры і смачны абед!

Назаўтра надвор'е паправілася. Зніклі хмары, ад самай раніцы прыгравала сонейка. Людзі ізноў выйшлі з сярпамі ў поле. Каб падагнаць страчаны час, бацькі не прыйшлі на абед дадому. Бабуля занесла ім на калёнію збанок кіслага малака, хлеб і па кавалачку сушанай куньпы. Праз два дні настала вялікая спёка, нельга было вытрымаць нават у цяні дрэў. Нат суседзі, якіх калёнія далёка, сёння прыйшлі адпачыць дамоў, пакуль сонца знізіцца і стане прахалодней. Бацькі вярнуліся з поля позна, паспешна з'елі хлеба з малаком. У хаце спаць было немагчыма. Мама разаслала куль саломы на ператочы клуні, заслала льнянай плахтай, паклала падушкі і ўсе мы радком паклаліся спаць. На свежым паветры хутка прыходзіць сон.

І так мінуў тыдзень. У суботу падвечар Манька, Віруля і Нінка пабеглі на рэчку памыцца; няважна, што далекавата, бо аж за паўтара кіламетра. Заўтра нядзеля, трэба быць чыстымі, а і ў царкву памаліцца бацькі выганяюць. На рэчку прыбягуць хлопцы, павыдурняцца можна. Пасля рэчкі моладзь сабралася ў нас на лаўцы, пад бэзам. Прыйшлі Косцік, Іваны, Васіль, Данька, Кудзя — усе, як заўжды. Далучыліся таксама дзяўчаты з Пескаў — Лідка, Ніна, Гандзя. І хоць удзень здорава нарабіліся, то, выкупаўшыся, уступілі ў іх новыя сілы. То пахіхікалі, то зноў грымнулі песню „Выпрагайтэ хлопці коні...". Моцныя галасы Косціка, Івана і ўспамагаючыя галаскі Вірулі і Манькі разносіліся па ўсіх Мацейках, а то і далей. Каля поўначы разышліся дамоў. Заўтра свята, можна даўжэй паспаць.

Нядзеля была сонечная і цёплая. Старэйшыя бабы, управіўшыся раненька, святочна апранутыя, завязаўшы пад падбароддзем белыя хустачкі, ішлі ў царкву. Пазней, за бабамі, беглі дзяўчаты з Пескаў, да якіх далучаліся нашыя, з Мацейкаў. Усе з падобнымі прычоскамі і вялікімі моднымі бантамі ў валасах. Суседка Надзя зграбна крочыла ў новенькіх чырвоных „жымках", а стройная, старэйшая Аніся спяшала на царкоўны хор у беленькіх кедах. Мая бабуля, таксама надзеўшы чорны святочны саян і карычневую ў белыя кветачкі накідку, патэпала за маладымі. Мужчыны не надта спяшаліся ў царкву, толькі дзядзька Карніла, высокі, сур'ёзны (як мне тады здавалася), з самой раніцы маршыраваў у храм. Усе яго паважалі, шмат гадоў быў ён царкоўным старастам. І доўгія гады жыў. Толькі сусед Аляксандр з самай раніцы рубаў дровы, аж рэха неслася па Мацейках. У царкву ён не хадзіў і са святам не лічыўся.

Пасля поўдня, ужо бліжэй вечара, малодшая моладзь сабралася на вуліцы ля Паўлавай і нашай хат, каб паіграць у лапту. Прыйшлі Надзіны сяброўкі, прынеслі мячык, які самі пашылі з анучак, акруціўшы каляровымі ніткамі. Збегліся хлапчукі з Мацейкаў — Пецька, Іван, Коля, Грыша, з Пескаў — Лукаш з Алёшкам ды іншыя. Падзяліліся яны на дзве каманды і пачалі гакаць палкамі ў мячык. Па ўсёй вуліцы разносіліся смех ды рогат. Непрыкметна сусед Коля вырваўся на свой панадворак і праз момант выйшаў на дыбах. Усе зарагаталі, успомніўшы, як яшчэ нядаўна ўсе бегалі на дыбах, дзяўчаты таксама. Мая сястра спрытна скакала на дыбах. Ля Колевай клуні стаяла высокая гайданка. У святочны дзень збіралася там моладзь — і старэйшая, і меншая. Хлопцы давалі „попісы", а дзяўчаты больш прыглядаліся, каторы з іх стане галавой уніз або яшчэ і перакруціцца на другі бок. Не ўсе былі такімі адважнымі, ды суседу Колю не было роўнага.

З панядзелка зноў у вёсцы стала ціха, затое на палях штораз больш прыбывала ляшкаў. Пад канец тыдня дзе-нідзе пачалі паяўляцца квяцістыя пэрэпеліцы.

— Мама, а калі мы злапаем пэрэпеліцу? — спыталася я ў мамы.

— У суботу, дзіцятка, у суботу!

Працавітыя дні здаваліся доўгімі і ўрэшце надышла субота. Бацькі пайшлі ў поле крыху пазней, сёння не спяшаліся. Сонца было ўжо з поўдня. Я ўзяла з палоўніка серп і таксама пабегла памагаць злапаць пэрэпеліцу. На полі заспела я не толькі бацькоў з сястрою, але і цётку Верку з дзядзькам Сцёпкам. Гэта нашы сваякі, калёнія якіх была недалёка нашай. Прыйшлі па-сяброўску памагчы дажынаць. Так было заведзена ў вёсцы — адны адным памагалі. Я, узяўшы серп у рукі і не слухаючы перасцярогі баценькі, пачала вучыцца жаць. „Навуку" закончыла я хутка, калі з мезенца пацякла кроў. Мама адарвала кавалак палатна, абвінула мой палец і загадала сядзець пад ляшкам. Многія гады шрам на пальцы прыпамінаў мне жніво. Пад вечар дажалі. Пакінулі жменю нязжатага жыта. Баценька сабраў каласкі ў руку і завязаў шнурком разам з сабранымі мною разнаколернымі палявымі кветкамі. У сярэдзіну мама паклала кавалачак хлеба.

Павязалі снапы, паставілі ляшкі ў радочкі і поле павесялела. Толькі пожня калола ў босыя ногі. Задаволеныя вярталіся ўсе мы дамоў. Цётка з дзядзькам таксама ішлі з намі, „на кілішачак", як сказаў бацька, — бо як жа ж, падзякаваць трэба. У хату вярталіся сцежкай ля рова. У суседа яшчэ стаяў доўгі загон жыта, і дзядзька Сцяпан з жонкай Ганнай і сям'ёй, не адгінаючыся, падзякавалі на нашае пажаданне „Божа, дапамажы!".

— Злапалі ўжо пэрэпеліцу? — спыталася суседка з калёніі, Манька Сацёўка, выглядваючы з мужам Пашкам з буды, якую паставілі сабе для адпачынку і прахалоды.

— Злапалі, злапалі, — адказала, усміхаючыся, мама.

У наступным тыдні жара трымалася. Людзі жалі авёс, ячмень, пшаніцу, якая ўжо пазалацела, ды рвалі грэчку. Сухія ляшкі гаспадары клалі ў вазы з драбінамі і звозілі ў клуню. Стораны запаўняліся збожжам, якое шчодра ўрадзіла. Неўзабаве Спаса, — трэба спяшацца сабраць усё з поля, каб спакойна заняцца пратаннем атавы, а наканец — капаннем бульбы.

Ніна БРУЧКО

Родная мова толькі для забавы?

Мяняюцца нашы вёскі і... людзі. Ужо шмат гадоў жыхароў вёсак закідаюць рознымі рэкламнымі лістоўкамі, засоўванымі ў форткі платоў. Людзі звыкліся з гэтым, хаця раней гэта здзіўляла і нават перашкаджала. Варта дадаць, што памянялася і культура падачы гэтай рэкламы. Раней разносчыкі надта груба навешвалі іх на платы, не зважаючы нават, ці хто там жыве. А бывалі і такія, што едучы малалітражкай запавольвалі машыну і раскідалі лістоўкі па вуліцах, не турбуючыся даставіць іх бліжэй адрасатаў. Бо тады фірмы плацілі разносчыкам за колькасць, але калі паявілася канкурэнцыя, тады сталі плаціць і за якасць, за культуру даручэння, а несумленных вытурылі з гэтай дзейнасці.

Сёлета я аднаўляў сваю агароджу з боку вуліцы і вось атрымаў я нагоду сустрэць маладога разносчыка лістовак і пагутарыць з ім. Юнака я не знаў і загаварыў да яго папольску. Зацікавіла мяне зарплата за гэтакую работу ў дождж і пагоду. Хлапчак аказаўся даволі размоўны: за адну лістоўку „Kaufland" засунутую ў веснічкі ў Орлі атрымлівае ён 15 грошаў, але па вёсках гэтая плата буйнее да 35 грошаў ад лістоўкі. Працуе ён на тэрыторыі Арлянскай гміны і ў вёсцы Леўкі; займаецца гэтым і ягоная сям'я.

Далей высветлілася, што разносчык выводзіцца з недалёкіх ад Орлі Спічкоў. Тады я, ужо на мясцовай мове, пацікавіўся, ці размаўляе ён па-свойму. Ён толькі заўсміхаўся, але калі я паўтарыў пытанне, ён адказаў:

— Czasem z kolegami rozmawiamy, ale tylko tak, dla żartów, dla zabawy.

Мяне гэта здзівіла і стаў я яго пераконваць, што сваёй мовы не трэба саромецца ці баяцца. Юнак, увесь час усміхаючыся, адказваў, што „пасвойму" ён разумее, але гэтай мовай не карыстаецца.

— Ale jak raz byliśmy z kolegami w Mielniku, — дадаў, — to tam rozmawialiśmy po swojemu, bo byli tam warszawiacy, to im tak na złość.

Вось такі сёння погляд — здаецца большасці — маладога пакалення на сваю родную мову. За кароткі час так памяняўся наш свет! Прыгадаў я сабе, як яшчэ звыш дзесяці гадоў таму адна з арлянскіх настаўніц жалілася мне, што ў школе быў клопат з дзяцьмі, якія ў першы клас прыходзілі з вёсак, у тым ліку і са Спічкоў. Тыя дзеткі зусім не ўмелі размаўляць па-польску, трэба было іх спярша вучыць размаўляць, а толькі пасля пісаць. А гэта таму, што ў той час дома іх бацькі размаўлялі толькі па-свойму.

Зараз такой праблемы з вясковымі першакласнікамі напэўна няма, а нават магчыма, што польскай мовы не ведалі бацькі цяперашніх вясковых дзяцей, якія зараз не ведаюць мовы сваіх дзядоў і прадзедаў.

Міхал МІНЦЭВІЧ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2008 r. upływa 5 grudnia 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2008 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Накład: 1 000 egz.

Суседскія былі

БАРАЦЬБА З „ЗЯЛЁНЫМ ЗМІЕМ"

Антыалкагольны курс Савецкага Саюза, абвешчаны ці то генеральным сакратаром ЦК КПСС Міхаілам Гарбачовым, ці то ягонай жонкай Раісай Максімаўнай, прывёў усю краіну ў стан змешаных эмацыйных пачуццяў. Гэта быў глыбокі шок ад разумення безнадзейнасці і непатрэбнасці працягу далейшага жыцця і дзікае захапленне настолькі смелым і рашучым учынкам, на які, паводле думкі звычайнага і незвычайнага абываценя, не меў права адважыцца ніхто, нават кіраўнік самай таталітарнай краіны свету з бязмежнымі запасамі ядзернай зброі і самым шматколькасным войскам, міліцыяй і КДБ.



Пазней казалі, што менавіта гэты курс і прывёў да поўнага развалу СССР. Маўляў, на цвярозую галаву людзі пачалі недапушчальна шмат думаць і дадумаліся да таго, што камуністычны лад не ёсць той мажлівай светлай будучыняй, якую прапагандавалі савецкія ідэолагі. Вось так, таварышы камуністы! Хацелі мець сваю дзяржаву, не трэба было змагацца з гарэлкай. Яе яшчэ ніхто не здолеў перамагчы. Гэта можа пацвердзіць любы доктар, які лечыць алкагалізм.

Але тады камуністы думалі, што могуць перамагчы ўсіх і ўсё. Гэтая самаўпэўненасць іх і пагубіла. Ды не толькі іх, але і парушыла баланс сіл ва ўсім свеце. Паводле меркаванняў усё тых жа, ужо цвярозых абывацеляў, вясёлы і вечна падвыпіўшы народ, які меў чым бавіць час, ніколі не змагаўся б з уладай. Ды і часу не было б на гэта. А што тычыцца міфічнай пагрозы ядзернай вайны, што нібыта зыходзіла ад саветаў, то і яна была немажлівай, бо п'яны палкоўнік ракетных войскаў, які адказваў за ядзерную кнопку, ніколі не націснуў бы на яе. Па-першае, дрыжачай ад перапою рукой ён не здолеў бы папасці на тую кнопку. А па-другое, загад п'янога генерала распачаць ядзерную атаку палкоўнік расцаніў бы або як псіхічнае ўздзеянне белай гарачкі на яго камандзіра, або як уласную пасляпахмельную галюцынацыю. Такім чынам, паводле гэтай тэорыі савецкіх грамадзян, менавіта гарэлка захоўвала спакой у краіне, ядзерны баланс сіл між дзяржавамі з рознымі палітычнымі сістэмамі і мір ва ўсім свеце. А так, як яе піць забаранілі ў неабходных для міру і спакою колькасцях, пацярпела ўся планета.

Але першымі, хто меў праблемы з-за антыалкагольнага ўказа, былі гродзенскія студэнты Уладзімір Макараў, Зміцер Дудко і Эльдар Айзенман. Хлопцы, як даведаліся пра гэтую знакавую падзею, адразу зразумелі яе гістарычнае значэнне і замест каб ісці на лекцыі прафесара Ісаака Абрамавіча Габрусёва, вырашылі азначыць яе кілішкам-другім празрыстай горкай вадкасці. Правёўшы ў гарачых спрэчках і філасофскіх разважаннях першую пару заняткаў, добра пасмялеўшыя студэнты наважыліся папасці на другую пару, каб даказаць прафесару, што зямная сіла прыцяжэння і ўвогуле гравітацыя не ў стане перашкодзіць чалавеку самастойна падняцца да нябёсаў, калі той гэтага вельмі хоча. Але як толькі яны выйшлі на вуліцу, іх спынілі ахоўнікі антыалкагольнага ўказа ў міліцэйскіх мундзірах і паставілі такім чынам крыж на распрацоўцы новай навуковай тэорыі.

А ў міліцэйскім пастарунку капітан Нарушэвіч у ненавязлівай, але даволі даходлівай форме давёў юнакам, што тыя парушылі апошнюю пастанову ўрада і з вучобы іх выкінуць як шкодных і нямытых кацянят з палаца ідэальнай чысціні.

— Задалбаюцца пыл глытаць, — заявіў Эльдар Айзенман, ужо адпушчаны з моцных лапаў праваахоўных органаў. — У мяне ўся радня — дактары. Пойдзем да дзядзькі Сямёна. Ён якраз працуе ў наркадыспансеры. Зробіць нам заключэнне, што мы не ўжывалі гарэлкі ад моманту нараджэння і хай мянты нас у азадак пацалуюць. Будзе выглядаць так, што нас абгаварылі.

Дзядзька Сямён сустрэў сваяка з неславянскай ветлівасцю, выслухаў і ўзяўся дапамагчы.

— Толькі трэба ўзяць у каго-небудзь цвярозага аналізы сліны, крыві і мачы, выдаць іх за вашы і паслаць у лабараторыю, якая і дасць заключэнне вашай невінаватасці, — заявіў ён.

— То, дзядзька, сам наплюй у прабірку, — прапанаваў Эльдар. — Мы то не можам, бо пілі сёння.

— Я сёння таксама крыху замахнуў за каўнер чыстага медыцынскага спірту, — скрывіўся дзядзька, даўшы зразумець, што знайсці сліны цвярозага чалавека нават для аналізаў у гэтай краіне не так проста.

— Можа медсястра твая.

— Яна квасіла разам са мной. І астатнія супрацоўнікі не могуць. Тыя на работу ўжо выйшлі пад шафэ. Трэба шукаць каго на вуліцы.

— О не! — у адзін голас зараўлі хлопцы. — Ну дзе ў дванаццаць гадзін дня ты на вуліцы знойдзеш каго цвярозага!

— Гэта праўда, — пагадзіўся доктар. — Ведаеце што, у суседнім аддзеле працуе адна дакторка. Яна цяжарная. На сёмым месяцы ўжо. Хіба яна будзе цвярозая.

Усе ўзрадаваліся як дурань фарбам, купілі дакторцы кветкі і падарунак з шакаладкі і двух плаўленых сыркоў і ўпрасілі здаць аналізы. Здавалася, пагроза згубіць вучобу адышла ў нябыт.

Але назаўтра да іх у інтэрнат прыляцеў дзядзька Сямён, напалоханы як чорт крыжа.

— Хлопцы, вам канец, — заявіў ён замест сказаць „Добры дзень". — Аналізы паказалі, што дакторка была п'янейшая за вас.

— Дык што ж рабіць?! — заенчылі юнакі. — Няма выйсця. Трэба купіць бутэльку каньяку і ісці ў міліцыю. Дадзім ім каньяк і будзем прасіць, каб не прысылалі паперу нам на вучобу.

Так і зрабілі. Капітан узяў каньяк, на іх вачах адчыніў, жагнуў кілішак і весела падміргнуў.

— На халеру каньяк куплялі? Толькі грошы выкінулі, — вяла прамямліў ён. — Хапіла б і звычайнай гарэлачкі. А наконт свінні па месцы вучобы, то не хвалюйцеся. Не вышлем. Няма чаго высылаць. Учора ў аддзеле мы так наклюкаліся гарэлкі, што залілі вашы пратаколы соусам ад селядца. Прыйшлося іх выкінуць у сметніцу як непатрэбную ганучу. Не пасылаць жа такія, залітыя. А то скажуць, што ў міліцыі адны алкаголікі працуюць. І так пра нас лгуць абы-што. Так што ідзіце і не пападайцеся нам больш п'янымі. Самі разумееце. Антыалкагольны ўказ выйшаў. Так сказаць, распачалася барацьба з „зялёным зміем". Пападацца цяпер п'яным у рукі міліцыі — нельга.

Віктар САЗОНАЎ

Адгаданка

1. часовае падняцце вады ў вадаёмах у выніку расставання снегу або вялікіх дажджоў, 2. яго знойдзеш, калі захочаш сабаку ўдарыць, 3. мястэчка над Асвейскім возерам, 4. туша жывёлы, якая ідзе ў ежу, 5. імя Тайлера, кіраўніка сялянскага паўстання ў Англіі ў 1381 годзе, 6. адсутнасць жадання працаваць, 7. дзікі афрыканскі конь з паласатай афарбоўкай поўсці, 8. прыняцце асвячонай аплаткі ў касцёле, 9. галоўны горад Абхазіі, 10. урачысты агляд войск, 11. судна з паравым рухавіком, 12. грывасты драпежнік у гараскопе, 13. „ваяўнічая" планета, 14. работнік склада.



Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 32 нумара

Газа, клоун, лапа, неба, цвіль.

Рашэнне: **З паклону галава не баліць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

16.09 – 22.09

Баран (22.03. — 20.04.) З 19.09. не едзь далёка, ды нават і на кароткія экскурсіі. Людзі, з якімі тады можаш пазнаёміцца, могуць падвяргнуць цябе сур'ёзнай небяспецы. Будзеш вельмі папулярны, ды не дай сабе ўзлезці на галаву.

Бык (21.04. — 21.05.) Можаш зачаравацца кімсьці з працы ці школы, ды ваша сувязь будзе толькі больш у тваёй уяве. Варта прыхарошыцца, бо вельмі спрыяе Венера красе і амалоджанню (калі каму трэба). Будзеш медыятарам для пасвараных бакоў.

Блізняты (22.05. — 22.06.) Можаш заззяць літаратурнымі талентамі. Чулымі слоўцамі і кампліментамі звядзеш каго захочаш. Немалыя праблемы ў пачуццях у замужніх і жанатых Блізнят, асабліва з 15-19.06. Не будзь лішне бунтарскі ды не шалей у справах здароўя.

Рак (23.06. — 23.07.) Перажывеш крыху нервовых хвілін, ды пра твой благі настрой і клопаты будуць ведаць толькі самыя блізкія асобы. Самотныя і роспачныя пасля расстання Ракі знойдуць суцеху. Бяры спакойна працу за мяжой, хоць будзеш моцна сумаваць па родных.

Леў (24.07. — 23.08.) Да 19.09. дасканалыя лады з шэфам. На працы ці ў школе будзеш як у хаце. Да 17.09. не падпісвай дамоў, якія маглі б звязаць табе рукі. 17-21.09. у асобы, з якой сустракаешся, уціхамірыш хворую ахвоту кантраляваць цябе; можаш парваць з ёю ўсе кантакты.

Дзева (24.08. — 23.09.) 17-21.09. проста неабмежаваная творчая ды шалёная фантазія дасць магчымасць выявіць у канкрэтным кшталце твае мары. Дзякуючы моцнай руцэ і ўражліваму сэрцу будзеш мець сімпатыю і павагу з боку супрацоўнікаў.

Шалі (24.09. — 23.10.) Будзеш поўны аптымізму. Сустрэнеш вельмі спрыяючыя табе асобы. Дагаворышся з усімі. 19-23.09. не ўваходзь у бліжэйшыя зносіны з кімсьці, каму не давяраеш. Таксама здаровую развагу захавай у фінансах.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) 17-21.09. будзеш вельмі патрабавальны і крытыканцкі, злосны на ўсё, на што раней не звяртаў увагі. Не ідзі ўсляпую да мэты, бо нічога з гэтага добрага не выйдзе. 19-23.09. можаш быць агрэсіўны, пабуджаны і запальчывы; не паказвай злосці, захавай халаднакроўе.

Стралец (23.11. — 22.12.) Да 18.09. будзеш мець ахвоту займацца і пераймаца справамі, якія цябе не павінны цікавіць. Летняя прыгода можа аказацца больш трывалай, чым здавалася. На працы ці ў школе пара закаціць рукавы і паказаць свае ўмеласці і магчымасці.

Казярог (23.12. — 20.01.) Да 16.09. вельмі добрыя зносіны з людзьмі. Да 18.09. прадбачваецца нервовасць, праблемы ў падарожжах і цяжкасці ў афармлянні службовых і юрыдычных спраў. Таксама ў кампаніі не ўсё будзе па-твойму. Не адкладвай абавязкаў.

Вадалей (21.01. — 19.02.) 15-19.09. вялікія поспехі ў сямейных і хатніх справах. Нечаканыя госці будуць прыемным сюрпрызам. Хоць ты сам не можаш уседзець на месцы (ды ўжо спакайней; планеты не будуць цябе турбаваць як раней).

Рыбы (20.02. — 21.03.) 17-21.09. будзеш ззяць новымі ідэямі і спрытам. Добры час на ўсялякія перагаворы і падпісванне дамоў. З 19.09. Нептун паказвае на расчараванне, незразуменне, няздзейсненыя абяцанні; ненайлепшы час і для фінансаў. Шырокі жэст можа не пайсці табе к дабру.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960